Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 94 (6773) | 22 жніўня 1940 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

2
Інвентар
БІБЛІЯТЭКІ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Сход актыва Брэсцкай партыйнай арганізацыі.
Раённы партыйны сход у Клімавічах.
ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:
Дапамагчы комсамолу ўзорна правесці выбары кіруючых органаў — кроўная справа партыйных арганізацый.
П. Багушэўскі — Партарганізацыя соўгаса ў барацьбе за высокі ўраджай.
Па-большэвіцку весці барацьбу з дэзарганізатарамі вытворчасці і іх патуральнікамі!
Н. Гіршын — Растратчыкі рабочага часу.
В. Фесько — Казакоў і яго апекуны.
НА ТЭМЫ ДНЯ. Высокаякасна апрацаваць лён.
АРТЫКУЛЫ.
Праф. І. Звавіч — Вайна ў Афрыцы.
А. Бялевіч — Будзёнаўцы.
І. Маркаў — Выдатна правесці сяўбу азімых.
П. Тарасік, П. Бітэль — Падрыхтавана сустрэнем вучэбны год.
М. Кін — На мінскім радыёзаводзе.
ЗА РУБЯЖОМ.
Прамова прэм'ер-міністра Фінляндыі Руці.
Выступленне Чэрчыля ў палаце абшчын.
Італьянская нота нейтральным краінам.
Паветраныя баі над Англіяй.
Дзеянні англійскай авіяцыі.
Паведамленне італьянскага камандавання.
Заява Рузвельта.

За большэвіцкае выхаванне кандыдатаў партыі!

Толькі за шэсць месяцаў у КП(б)Б прынята 6.165 новых членаў і 6.927 кандыдатаў у члены партыі. Гэта сведчыць аб далейшым арганізацыйным умацаванні большэвіцкай партыі, аб яшчэ большым умацаванні яе сувязей з масамі. Цэнтральны Камітэт ВКП(б) заўсёды клаў і ўдзяляе велізарную ўвагу выхаванню кандыдатаў партыі. У мінулым годзе Цэнтральны Камітэт ВКП(б) падкрэсліваў, што «важнейшай задачай партыйных арганізацый з'яўляецца большэвіцкае выхаванне новапрынятых у партыю як на практычнай рабоце, так і шляхам павышэння ўзроўню іх тэарэтычнай падрыхтоўкі».

Работа з кандыдатамі партыі, упрагненне іх у актыўнае партыйнае жыццё, дапаты аб павышэнні іх тэарэтычных і агульнакультурных ведаў — важнейшая задача. Партыя Леніна—Сталіна заўсёды дабівалася аб настойным папаўненні сваіх радоў. У партыю прымаюцца, у адпаведнасці з строгага індывідуальнага адбору, толькі людзі перадавыя, праверэныя на розных участках барацьбы за соцыялізм. Статутам ВКП(б) устанаўліваецца гадовы кандыдацкі стаж для ўступаючых у партыю. Кандыдацкі стаж неабходзен для таго, каб «за гэты тэрмін кандыдат мог выявіць грунтоўнае азнаямленне са статутам, праграмай і тактыкай партыі, каб партыйная арганізацыя магла пераканацца аб асабістых якасцях кандыдата» (Сталін).

Аднак гэтыя патрабаванні не выконваюцца ў многіх партыйных арганізацыях.

У Слуцкай раённай партарганізацыі кандыдаты ў агульным саставе арганізацыі складаюць звыш 30 проц. Выраслі пытанне аб прыёме ў партыю таго ці іншага таварыша, сказаўшы яму некалькі слоў аб неабходнасці вывучаць гісторыю ВКП(б), Слуцкі райком на гэтым лічыць сваю місію закончанай. Дапушчаны клопатаў аб выхаванні новапрынятых у партыю райком не праяўляе. Такая нягодная практыка прывяла да таго, што значная частка кандыдатаў не адзначаецца ў актыўнае партыйнае жыццё, не азнаёмлена з статутам, праграмай і тактыкай партыі, з арганізацыйнымі прынцыпамі большэвізма.

Нялаўна тут абмяркоўвалася пытанне аб прыёме ў члены ВКП(б) кандыдата партыі статыстыка аддзела кадраў райкома тав. Карпавай. Выяснілася, што тав. Карпава палітычна непісьменная, за час кандыдацкага стажа яна нават не азнаёмілася з статутам і праграмай партыі. Парторганізацыя ўстрымалася ад прыёму тав. Карпавай у члены партыі. Але ці толькі Карпава вінавата ў сваёй палітычнай непісьменнасці? Вядома, не. Вялікая доля віны кладзецца на парторганізацыю. Слуцкі райком КП(б)Б часам склікае нарады кандыдатаў партыі. Але на гэтых нарадах гаварыць аб рабоце з кандыдатамі «наогул і ў цэлым». За гэтымі агульнымі размовамі райком не бачыць жывых людзей з іх рознай агульнаадукацыйнай і палітычнай падрыхтоўкай, з рознымі пахіламі і зацікаўленнямі.

Райкомаўцы самазадаволена пешаць сябе думкай, што ўсе кандыдаты партыі самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Але гэта нікому непатрэбнае самаашуканства. Як, скажам, можа самастойна вывучаць Кароткі курс кандыдат партыі калгасніца тав. Цыганкова, калі яна да гэтага не падрыхтавана, зусім непісьменная, не ўмее чытаць? Перш чым патрабаваць ад яе самастойнага вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», партыйная арганізацыя абавязана была паклапаціцца аб ліквідацыі яе агульнай непісьменнасці. Тое-ж можна сказаць і аб іншых кандыдатах партыі.

У первічнай партарганізацыі медыцынскіх устаноў г. Слуцка пяць кандыдатаў. Але ні адзін з іх нідзе не вучыцца. За ўвесь час з кандыдатамі партыі праведзена толькі адна гутарка аб статуце ВКП(б).

На жаль, такое становішча не толькі ў Слуцкай партыйнай арганізацыі. Гэта ў роўнай меры датычыць і Чырвонаслабодскай, Чашніцкай, Перахаўскай, Кіраўскай, Чырвонапольскай і многіх іншых раённых партыйных арганізацый. Дарэчы сказаць, звыш палавіны састава гэтых арганізацый складаюць кандыдаты.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) нядаўна ўказаў на памылкі і недахопы ў справе прыёму новых членаў і кандыдатаў ВКП(б) і патрэбаваў ад партыйных арганізацый поўнасцю аднавіць значэнне кандыдацкага стажа, як сур'ёзнага выпрабавання для жадаючых уступіць у члены ВКП(б), забяспечыць за час праходжання кандыдацкага стажа праверку палітычных і дзелавых якасцей кандыдатаў і дапамагчы ім азнаёміцца з праграмай, статутам, тактыкай партыі.

Праверка дзелавых і палітычных якасцей кандыдата, яго рост, выхаванне прамыслімы без актыўнага ўдзелу ва ўнутрыпартыйным жыцці. Мала рэгулярна наведваць сходы, своечасова плаціць членскія ўзносы. Кожны кандыдат партыі абавязаны выконваць партыйныя даручэнні. Комуніст правяраецца, выхоўваецца і гартуецца на практычнай рабоце, у барацьбе за выкананне рашэнняў партыі і ўрада.

Выхаваўчае значэнне партыйнага даручэння для кожнага комуніста неацэнімае. Аднак многія забываюць аб гэтым. У первічнай партыйнай арганізацыі швейнай фабрыкі імені Крупскай (Мінск) многія кандыдаты і маладыя члены партыі зусім не маюць партыйных даручэнняў, не прымаюць удзелу ў жыцці партыйнай арганізацыі. Кандыдат партыі тав. Казубенка за прыёму ў рады ВКП(б) часта выконвала грамадскую работу, была агітатарам у пэху. Пасля-ж прыёму яе ў кандыдаты ВКП(б) ніякіх партыйных даручэнняў ёй не даюць. У такім-жа становішчы апынуўся і кандыдат партыі тав. Герасімовіч. Больш года з'яўляецца кандыдатам партыі тав. Місючэнка. За гэты час первічная парторганізацыя соўгаса «Доктаравічы», Копыльскага раёна, не давала тав. Місючэнка ні аднаго партыйнага даручэння.

У значнай ступені гэтым і аб'ясняецца той факт, што ў партыйных арганізацыях ёсць вялікая колькасць кандыдатаў з пратэрмінаваным стажам. У Віцебскай абласной партыйнай арганізацыі іх налічваецца 1323 (усяго кандыдатаў 5.172), прычым 580 чалавек прабываюць у кандыдатах ад 4 да 10 год. Вялікая колькасць кандыдатаў з пратэрмінаваным стажам у Мінскай, Гомельскай, Беластоцкай і іншых арганізацыях.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) тав. Жданаў гаварыў: «Найбольш буйным недахопам з'яўляецца зусім нездавальняючая ў многіх парторганізацыях работа з кандыдатамі, якая прыводзіць да стварэння таго званых «вечных» кандыдатаў, якія знаходзяцца ў кандыдатах па 6—7—8 і больш год. Замест таго, каб кадр кандыдатаў быў жывым рэзервам, з якога партыя штодзённа чэрпае свежыя папаўненні, ён ператварыўся ў радзе арганізацый у свайго роду «недатыкальны фонд».

Задача кожнай партыйнай арганізацыі выканаць указанні ЦК ВКП(б) аб рабоце з кандыдатамі партыі, аднавіць значэнне кандыдацкага стажа. Клапоцячыся аб павышэнні тэарэтычнага ўзроўню кандыдатаў, партыйныя арганізацыі абавязаны на практычнай рабоце правяраць іх дзелавыя і палітычныя якасці, выхоўваць у духу найстражэйшага захавання партыйнай і працоўнай дысцыпліны. Кожнаму ўступаючаму ў рады ВКП(б) павінна прад'яўляцца патрабаванне — быць перадавіком, ісці ў авангардзе мас, заўсёды быць актыўным барацьбітом з перажыткамі капіталізма ў адносінах да працы і ў быце.

Кіраўнікі партыйных арганізацый абавязаны помніць, што клопаты аб дастойным папаўненні радоў ВКП(б), большэвіцкім выхаванні кандыдатаў партыі з'яўляюцца іх первейшым абавязкам.

СХОД АКТЫВА БРЭСЦКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

БРЭСТ, 21 жніўня. (Кар. «Звязды»). 20 жніўня адбыўся сход актыва Брэсцкай партыйнай арганізацыі. На сходзе прысутнічала больш 650 чалавек.

З дакладам аб рашэннях ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б) выступіў член бюро ЦК КП(б)Б—нарком унутраных спраў БССР—тав. Цанава.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Першым выступіў сакратар Жабінкаўскага райкома партыі тав. Кароткін. Ён расказаў сходу аб тым, як партыйная арганізацыя ўзначаліла барацьбу за паспяховую ўборку ўраджаю, як кіруе хлебапастаўкамі.

— Наш раён,—гаворыць тав. Кароткін,—ужо выканаў 50 процантаў гадавога плана хлебапаставак. Усе 7 калгасаў поўнасцю разлічыліся з дзяржавай. Прыклад калгаснікаў натхняе і сялян-аднаасобнікаў. У нас ёсць цэлыя вёскі,—Агароднікі і іншыя,—якія таксама поўнасцю выканалі свае абавязацельствы па хлебапастаўках.

Горш абстаіць справа з ажыццяўленнем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Уся работа ў нас звялася пакуль што да мітынгаў, дакладаў і чытак. Сапраўднай-жа барацьбы за выкананне Указа няма. Мы не арганізавалі кантроль первічных партарганізацый над ажыццяўленнем Указа.

— Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР,—адзначае начальнік палітаддзела Брэсцкага аддзялення чыгункі тав. Жукаў,—унёс больш арганізаванасці ў нашу работу, дапамог у выкананні вытворчых планаў. Цэнтральныя вагонныя майстэрні, напрыклад, пасля Указа пачалі сістэматычна перавыконваць план па выпуску з рамонту пасажырскіх і таварных вагонаў. 150 рабочых дэпо ўдвая перавыконваюць новыя нормы выпрацоўкі. Больш ста чалавек перавыконваюць дзённую норму да 175 проц. У майстэрні за ўвесь час быў адзін выпадак нарушэння Указа.

Але так працуюць далёка не ўсе нашы прадпрыемствы і службы. 159 выпадкаў нарушэння працоўнай дысцыпліны налічваецца па нашаму аддзяленню, 65 процантаў з іх прыпадае на пагрузачна-разгрузачную кантору. Кіраўнікі гэтай канторы і начальнік аддзялення тав. Елін няньчацца з прагульшчыкамі. На жаль, сярод прагульшчыкаў ёсць асобныя комуністы. Партыйная арганізацыя ліберальнічае з гэтымі дэзарганізатарамі вытворчасці. Комуніст Гуз не раз падвяргаўся спагнанням за розныя нарушэнні партыйнай дысцыпліны. Але ніякіх вываданў для сябе з гэтага ён не зрабіў. Нядаўна Гуз з'явіўся на работу ў п'яным выглядзе. Яго не дапусцілі да работы. А партыйная арганізацыя 2-й дыстанцыі пуці ніяк не знаходзіць дастатковага падстаў, каб выключыць Гуза з радоў ВКП(б).

Партыйны актыў чакаў, што пракурор абласці тав. Амілаеў і старшыня абласнога суда тав. Рагуновіч у сваіх выступленнях ускрыюць памылкі, якія дапушчаны следчымі і судовымі органамі. Але гэтага не здарылася. Яны гаварылі аб усім—і аб задачах у сувязі з Указам, і аб карысці працоўнай дысцыпліны, але ні слова не сказалі аб тым, як пракуратура і судовыя органы змагаюцца за ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

— На малых прадпрыемствах, дзе няма первічных партыйных арганізацый (цагельны завод, Водакапал і інш.),—гаворыць работнік абласной газеты «Зара» тав. Рабіновіч,—зусім не вядзецца масава-палітычная работа. І таму там ёсць многа фактаў грубага нарушэння Указа. Ніхто на іх своечасова не рэагуе.

— Многія партыйныя актывісты, — прадаўжае тав. Рабіновіч,—не прымаюць удзелу ў правядзенні агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва, не паказваюць прыкладу. Сакратары і члены бюро гаркома, члены бюро абкома і іншыя адказныя работнікі не правялі ні адной гутаркі на прадпрыемствах і ва ўстановах.

Тт. Трускін (старшыня облспажыўсаюза), Малаховіч (облплодагародніна) гаварылі аб задачах загатоўчых арганізацый, якія выпякаюць з пастановы пленума ЦК ВКП(б).

З вялікай увагаю выслухаў сход актыва прамову сакратара ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка. Усяго ў спрэчках выступіла 10 чалавек.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі сход адобрыў рашэнні ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б) і заклікаў партыйную арганізацыю па-большэвіцку іх выканаць.

Г. АНІШЧУК.

РАЁННЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД Ў КЛІМАВІЧАХ

20 жніўня ў Клімавічах адбыўся раённы партыйны сход. Прысутнічала 175 членаў і 85 кандыдатаў партыі. Даклад аб выніках ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б) зрабіла сакратар райкома партыі тав. Харланава. У спрэчках выступіла 8 чалавек.

Сход рашуча асудзіў выпадкі нарушэнняў пастановы пленума аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў. У паасобных месцах не пакончана з антызяржаўнай практыкай. Кіраўнікі калгаса «Чырвоны араты» размеркавалі паміж калгаснікамі 15 тон збожжа, у той час як дзяржаве яшчэ не было здана ні аднаго кілограма.

Не арганізаван яшчэ як трэба кантроль первічных партарганізацый над выкананнем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Выступаўшыя ў спрэчках таварышы адзначылі, што многія комуністы толькі гавораць аб дысцыпліне, а на справе самі патураюць прагульшчыкам. Дырэктар Мілаславіцкай МТС напісаў загад аб прыцягненні бухгалтара Касачова да адказнасці за спазненне, а намеснік дырэктара па палітчастцы тав. Мамантаў укрывае прагульшчыка ад суда, даказваючы, што быццам-бы ён спазніўся не на 27, а на 13 мінут і заслугоўвае толькі дысцыплінарнага спагнання.

Тав. Барончанка ў сваім выступленні расказаў, што сакратар Мілаславіцкага сельсовета кандыдат партыі Шлыкоў у рабочы час адлучаецца з сельсовета як-быццам па справах службы. Фактычна-ж аказваецца, што ён ідзе п'янстваваць. Первічная партыйная арганізацыя прыцягнула яго да партыйнай адказнасці.

Тав. Недлін гаварыў аб непаваротлівасці раённых следчых органаў, аб адсутнасці аператыўнасці ў разглядзе спраў аб прагульшчыках.

Раённы партыйны сход аднадушна адобрыў рашэнні пленума ЦК ВКП(б) і намеціў практычныя мерапрыемствы па іх выкананню.

(БЕЛТА).

Герой Совецкага Саюза малодшы палітрук Сцяпан Міхайлавіч Жолаб.
(Фотахроніка БЕЛТА).

ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ МТС ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН ТРАКТАРНЫХ РАБОТ

Лельчыцкая машынна-трактарная станцыя датэрмінова выканала гадавы план трактарных работ. На 20 жніўня трактарамі ўзаран 10.221 гектар пры плане 10. 200 гектараў.

Прадаўжаем палявыя работы, разгортваем малацьбу азімых і яравых культур.

ГАРЭЛІК,
дырэктар Лельчыцкай МТС.

Разгортваецца масавая сяўба азімых

ЧЭРВЕНЬ, 21 жніўня. (Па тэлефону). У калгасах раёна пачалася масавая сяўба азімых. У сельскагаспадарчай арцелі «Кастрычнік», Грабенскага сельсовета, засеяны першыя 25 гектараў азімага жыта, у калгасе імені Тімірязева — 16 гектараў, «Вызваленне» — 27 гектараў.

Арганізавана праходзіць сяўба азімага жыта і пшаніцы ў калгасах Руднянскага сельсовета. У сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны шлях» засеяна 20 гектараў, імені Карла Маркса — 12 гектараў. Усяго па раёну на 20 жніўня засеяна 177 гектараў азімых.

М. КРУК.
Н. КУРАЛЕЙ.

ЗАСЕЯНА 40 ГЕКТАРАЎ АЗІМЫМІ

СЛУЦК, 21 жніўня. (Па тэлефону). Перагадавыя калгасы раёна пачалі сяўбу азімых культур. Першымі выйшлі на сяўбу калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Прамень комуны», Серадняковускага сельсовета. Гэта насенневодчы калгас, удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. У першы дзень засеяна 40 гектараў жыта і пшаніцы.

Пачалі сяўбу і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Будзённага. Сяўба праводзіцца радковымі сеялкамі пратручаным сартавым насеннем.

Я. КУЧАР.
П. КУЦЦЯ.

Па Совецкай краіне

Паведамленне ТАСС

За апошнія дні ў замежным друку (амерыканскае агенцтва Юнайтэд Прэс, англійская газета «Сандэй дыспетч», фінляндская газета «Уусі суомі» і інш.) паявіліся паведамленні аб пачынаючыхся або ўжо вядучыхся ваенных перагаворах паміж СССР, Турцыяй і Грэцыяй па поводу заключэння саюза паміж гэтымі краінамі.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўказаныя паведамленні пазбаўлены ўсякіх падстаў і з'яўляюцца суцэльным вымыслам.

У апошнюю гадзіну

Паветраныя баі над Англіяй

БЕРЛІН, 21 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, учора германская авіяцыя з поспехам бамбардыравала некалькі аэрадромаў у графстве Кент. Зараз баі ідуць над паўднёва-ўсходняй часткай Англіі. Буйныя злучэнні англійскіх знішчальнікаў атакавалі германскую бамбардыровачную авіяцыю ў раёне Дуўра. Зенітная артылерыя таксама адкрыла агонь у многіх пунктах паўднёвага ўзбярэжжа Англіі. Рэзультаты бою невядомы. Бой у паветры прадаўжаецца.

Дзеянні англійскай авіяцыі

БЕРЛІН, 21 жніўня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў ноч на 20 жніўня англійскія самалёты зрабілі налёт на адзін з буйных гарадоў Рурскай абласці. Разбурана некалькі дамоў. Налічваецца шэсць забітых і 25 раненых. У адным з гарадоў Заходняй Германіі разбуран рад дамоў, у горадзе многа цяжка раненых. У другім раёне, у Цэнтральнай Германіі, бомбай пашкоджан ангар.

Конкурс на праект помніка П. І. Чайкоўскаму

Камітэт па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР праводзіць закрыты конкурс на лепшы праект помніка вялікаму рускаму кампазітару П. І. Чайкоўскаму. Помнік будуецца ў Маскве паводле рашэння ўрада ў азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння кампазітара, якое краіна адзначала ў маі. Ён будзе пабудован перад будынкам Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі ім. П. І. Чайкоўскага.

Камітэт па справах мастацтваў даручыў выдавецтву «Мастацтва» прыступіць да выпуску юбілейнага альбома, прысвечанага жыццю і творчай дзейнасці П. І. Чайкоўскага (ТАСС).

Бронзавая пудра

Восенню мінулага года ў Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце па апрацоўцы каляровых металаў і сплаваў (Масква) была створана лабараторыя металічных парашкоў. У сучасны момант лабараторыяй распрацавана тэхналогія вытворчасці бронзавай пудры.

Прымяняючаяся ў розных галінах прамысловасці—у друкарскай справе для залатога ціснення, у скульптуры для бранзіравання статуэтак, пры лепных работах і, нарэшце, для ахоўнага пакрыцця дэталей машын—бронзавая пудра да гэтага часу імпартыравалася. Работа супрацоўнікаў лабараторыі інстытута дазваляе ў найкарацейшы тэрмін спыніць прывоз яе з-за граніцы.

Вытворчасць бронзавай пудры паспяхова асвайваецца на адным з заводаў Галоўколерметапрацоўкі. Першая партыя прадукцыі будзе выпушчана ў III квартале гэтага года.



Да 165-годдзя клінічнай больніцы 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута (23 жніўня 1940 года). На здымку: будынак клінічнай больніцы (Пятроўскія вароты), які пабудаван у 1775 годзе.

Фото І. Мальскага. (Фотакліша ТАСС).

Энцыклапедыя іхтыялогіі

ЛЕНІНГРАД, (ТАСС). Выдавецтва Акадэміі навук СССР выпускае навуковую працу «Система рыб, ныне живущих и ископаемых», якая з'яўляецца рэзультатам саракагадовай навуковай дзейнасці віднейшага совецкага спецыяліста ў галіне іхтыялогіі праф. Л. С. Берга.

Скарыстаўшы параўнаўчы анатамічны метад і веды ў галіне палеанталогіі і эмбрыялогіі, вучоны апісвае ў кнізе сваю сістэму класіфікацыі рыбападобных.

Праца Л. С. Берга з'явіцца энцыклапедыяй па іхтыялогіі. У кнізе апрача падрабязнай характарыстыкі ўсіх атрадаў і падатрадаў прыводзіцца поўны пералік усіх сямействаў і падсямействаў як цяпер жывучых, так і выкапнёвых рыбападобных.

Кніга адначасова друкуецца на рускай і англійскай (міжнароднай у іхтыёлагаў) мовах. Яна багата ілюстрыравана.

„Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" на літоўскай, латышскай і эстонскай мовах

Выдавецтва «Літаратура на замежных мовах» выпусціла «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» на літоўскай, латышскай і эстонскай мовах. Тыраж кожнага выдання —25 тысяч экземпляраў. (ТАСС).

Паравоз „ФД" з водападагрэвам

ВАРАШЫЛАЎГРАД, 21 жніўня. (ТАСС). На Варашылаўградскім паравозабудаўнічым заводзе імені Кастрычніцкай рэволюцыі прыступілі да вырабу паравоза «ФД» з водападагрэвам.

У адрозненне ад звычайных паравозаў гэтай серыі машына абсталёўваецца спецыяльным адсекам у тэндэрным вадзяным баку з турбанасосам-змясіцелем. Гэта дасць магчымасць адбіраць частку адпрацаванай пары і накіроўваць яе ў адсек вадзянога бака. Тут яна змешваецца з халоднай вадой і падагравае ваду перад паступленнем у кацёл паравоза да 80—85 градусаў.

У рэзультаце дасягаецца эканомія больш 10 тон паліва на адным паравозе пры 1000-кілометровым прабегу. Паляпшаецца эксплаатацыя катла і павялічваецца міжпрамывачны прабег машыны.

У верасні павінны быць выпушчаны першыя пяць паравозаў «ФД» з водападагрэвам.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ДАПАМАГЧЫ КОМСАМОЛУ ЎЗОРНА ПРАВЕСЦІ ВЫБАРЫ КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ—КРОЎНАЯ СПРАВА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

★ ★ ★

АЖЫВІЛАСЯ КОМСАМОЛЬСКАЯ РАБОТА

(Гутарка па тэлефону з сакратаром Аршанскага гаркома КП(б)Б тав. І. В. КАМІСАРАВЫМ)

Выбары кіруючых комсамольскіх органаў маюць вялікае палітычнае значэнне не толькі для комсамола, а і для ўсёй нашай партыі, для ўсёй краіны. Яны павінны падняць усю комсамольскую работу на новую, больш высокую ступень.

Поспех надыходзячых выбараў будзе залежаць ад большэвіцкай дапамогі комсамолу з боку партыйных арганізацый. Улічваючы гэта, Аршанскі гаралскі камітэт КП(б)Б правёў рад мерапрыемстваў па аказанню дапамогі комсамольскай арганізацыі ў падрыхтоўцы да выбараў.

Паводле зацверджанага бюро гаркома партыі плана выбары ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях Оршы будуць праведзены з 1 па 13 верасня. 15 верасня адбудзецца справаздачна-выбарны сход комсамольскай арганізацыі чыгуначнага вузла і 19—20 верасня — гарадская канферэнцыя комсамола.

Для аказання штодзённай дапамогі да кожнай пярвічнай комсамольскай арганізацыі прымацаваны прадстаўнікі гаркомаў партыі і комсамола. Да буйнейшых арганізацый ЛКСМБ — ільнокамбіната чыгуначнага вузла і іншых—прымацаваны інструктары гаркома КП(б)Б.

Пярвічныя партарганізацыі праводзяць сходы і пасяджэнні бюро з дакладамі сакратароў комсамольскіх арганізацый аб ходзе падрыхтоўкі да прадстаячых выбараў. Па гэтаму-ж пытанню гарком КП(б)Б правёў нараду сакратароў пярвічных партыйных і комсамольскіх арганізацый горада.

У рэзультаце ўсіх нашых мерапрыемстваў значна ажывілася ўнутрысаюзная работа, умацавалася вядучая роля комсамольцаў на вытворчасці. Усю асноўную комсамольскую работу вядуць зараз маладыя актывісты. У камісіях гаркома ЛКСМБ працуюць 58 комсамольцаў і комсамолак горада.

Школьная камісія райкома ЛКСМБ правяла рэйд праверкі падрыхтоўкі школ да вучэбнага года. Комсамольскія брыгады праверылі ўсе школы горада і прадставілі ў гарком партыі вельмі сур'ёзны матэрыял, на аснове якога мы правялі нараду дырэктароў школ і работнікаў аддзела народнай асветы.

Прыкладам узрослай ролі комсамольцаў на вытворчасці можа служыць комсамольская арганізацыя механічнага завода «Чырвоны барэц». Усе комсамольцы гэтага завода выконваюць нормы 8-гадзіннага рабочага дня, а большасць з'яўляюцца стаханаўцамі. Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі калектыў завода абавязаўся выпусціць да канца 1940 года дадатковай прадукцыі на 248 тыс. руб.

Арганізацыі ЛКСМБ павінны ўзмацніць барацьбу за рэалізацыю Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. Многія комсамольскія арганізацыі горада да апошняга часу гэтай важнейшай дзяржаўнай справе не налавалі належнай увагі. Сярод прагульшчыкаў аказалася 25 комсамольцаў.

На прадпрыемствах і ва ўстановах праводзяцца зараз адкрытыя комсамольскія сходы, прысвечаныя Указу. 28 жніўня склікаецца агульнагарадскі сход комсамольскага актыва. На сходзе будзе пастаўлен даклад сакратара гаркома КП(б)Б аб выніках ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б).

★ ★ ★

УМАЦАВАЦЬ ПЯРВІЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

(Гутарка па тэлефону з сакратаром Крычаўскага райкома КП(б)Б тав. А. Т. БАНЧЫКАВЫМ)

6 жніўня ў нас адбыўся пленум райкома КП(б)Б з удзелам сакратароў пярвічных партыйных арганізацый. Пленум дэтальна абмеркаваў даклад сакратара райкома ЛКСМБ тав. Страпчанка аб падрыхтоўцы да выбараў кіруючых комсамольскіх органаў. У якасці важнейшай задачы на час выбараў пленум паставіў арганізацыйнае ўмацаванне кожнай пярвічнай комсамольскай арганізацыі, перабудовы іх работы ў адпаведнасці з рашэннямі XI пленума ЦК ВЛКСМ.

Для дапамогі пярвічным комсамольскім арганізацыям у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў мы вылучылі 102 чалавекі з ліку партыйна-комсамольскага актыва. Вылучаныя таварышы азнаёмлены з рашэннямі XI пленума ЦК ВЛКСМ, пастановаю і інструкцыяй аб выбарах кіруючых комсамольскіх органаў.

У многіх арганізацыях комсамольская гаспадарка ў запушчаным стане, асобныя комсамольцы маюць вялікую запазычанасць па членскіх узносах, слаба прымаюць удзел у комсамольскім жыцці. Зараз гэтыя недахопы ліквідуюцца.

Да актыўнай работы прыцягваюцца новыя кадры актыва з ліку маладых комсамольцаў. Пярвічныя комсамольскія арганізацыі ўзмацняюць свой удзел у дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці.

Комсамольцы калгаса «Чырвоны пахар», Бельскага сельсовета, з'явіліся ініцыятарамі поўнага заканчэння абмалоту ўсіх зернавых і выканання абавязкаў перад дзяржавай да 20 жніўня.

Значна ўзмацніўся ўдзел у вырашэнні гаспадарчых задач калгасных комсамольскіх арганізацый Маляўцкага сельсовета. Пры дапамозе комсамольцаў калгасы сельсовета з поспехам закончылі ўборку. амаль поўнасцю разлічыліся з дзяржавай.

Комсамольцы чыгуначнага вузла, цэментнага завода, калгасаў «Чырвоны шлях», «Краіна Советаў» дэтальна азнаёміліся ўжо з інструкцыяй аб выбарах кіруючых комсамольскіх органаў. У гэтых і многіх іншых пярвічных комсамольскіх арганізацыях раёна прыступілі да складання справаздач.

Вялікая і адказная справа

(Гутарка з сакратаром Кагановіцкага райкома КП(б)Б г. Мінска т. І. І. КАЗЛОЎСКІМ)

Комсамол рыхтуецца да важнейшай падзеі ў сваім жыцці — выбараў кіруючых комсамольскіх органаў. Дапамагчы комсамольскім арганізацыям правесці выбары на высокім ідэйным узроўні, вылучыць да кіраўніцтва малады актыў, дзяўчат, смялей ажыццяўляць рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ аб перабудове комсамольскай работы — такую задачу паставіў перад сабой Кагановіцкі райком КП(б)Б.

На бюро райкома КП(б)Б была заслухана справаздача сакратара райкома ЛКСМБ тав. Доўнара аб падрыхтоўцы да выбараў. Райком партыі прыняў рашэнне, у якім намечаны практычныя мерапрыемствы па аказанню дапамогі комсамольскім арганізацыям. У райкоме адбылася нарада сакратароў пярвічных парт арганізацый па гэтаму-ж пытанню. 23 жніўня на бюро райкома КП(б)Б будуць заслухоўвацца справаздачы сакратароў трох пярвічных партарганізацый аб кіраўніцтве падрыхтоўкай да надыходзячых выбараў у комсамоле. Для аказання дапамогі ў правядзенні выбараў да буйнейшых комсамольскіх арганізацый прымацавана 28 членаў партыі.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі раёна палепшылі сваё кіраўніцтва комсамолам. Сакратар партыйнага бюро вагона рамонтнага завода імені Мяснікова тав. Лобач правёў нараду з членамі камітэта ЛКСМБ, на якой паставіў перад комсамольцамі рад задач па падрыхтоўцы да выбараў.

Добра дапамагае комсамолу партарганізацыя абутковай фабрыкі імені Тэльмана Комуністы, прымацаваныя да комсамольскіх груп, дапамаглі разгарнуць дзейную падрыхтоўку да выбараў. На фабрыцы на высокім узроўні праведзены комсамольскія сходы па абмеркаванню рашэнняў XI пленума ЦК ВЛКСМ і па распрацоўцы плана падрыхтоўкі да выбараў. Як празіла, у рабоце сходаў прымалі актыўны ўдзел комуністы, у тым ліку члены партыйнага бюро. Комсамольцы ўжо закончылі вывучэнне інструкцыі аб выбарах. На фабрыцы значна паднялася актыўнасць комсамольцаў у вытворчай і грамадскай рабоце. Комсамольская арганізацыя ўмела раз'ясніць моладзі значэнне Указаў ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня. У рэзультаце — на фабрыцы няма ні аднаго прагулу не толькі ў комсамольцаў, але і сярод несаюзнай моладзі.

На фабрыцы «Кастрычнік» вырас новы комсамольскі актыў. Да актыўнага грамадскага жыцця і да комсамольскай работы прыцягнута 36 маладых членаў ЛКСМБ.

Райком КП(б)Б ставіць перад комсамольскімі арганізацыямі сур'ёзную задачу — «амаладзіць» кіруючыя кадры комсамольскіх работнікаў. Зараз у раёне 84 сакратары камітэтаў ЛКСМБ ва ўзросце ад 26 да 33 год. Трэба вылучыць да кіраўніцтва маладых, ініцыятыўных, задорных юнакоў і ў асаблівасці дзяўчат.

Мы патрабавалі ад комсамольцаў узмацнення большэвіцкай пільнасці пры выбарах, каб у кіруючыя органы былі выбраны сапраўды перадавыя, да канца адданыя справе комунізма людзі.

Райком КП(б)Б патрэбаваў ад райкома комсамола павесці поўны парадак у комсамольскай гаспадарцы. Трэба сказаць, што ў гэтых адносінах райком ЛКСМБ праяўляе абураючую бясклопатнасць, якою часта карыстаюцца прахадзімцы з комсамольскім білетам у кішэні. Так, напрыклад, сакратар камітэта ЛКСМБ фабрыкі ім. Кагановіча Гулаў (на жаль, ён і кандыдат партыі) прысвоіў больш двух тысяч рублёў членскіх комсамольскіх узносаў. Дрэнна арганізавана ў райкоме комсамола справаздачнасць, учот і інфармацыя. У паравозным дэпо зрабілі прагул тры комсамольцы. Усе яны ўжо асуджаны, а райком комсамола нічога не ведае аб гэтым.

Выбары кіруючых комсамольскіх органаў — справа вялікая і адказная. Партыйныя арганізацыі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у кіраўніцтве выбарамі, усямерна дапамагчы комсамольскім арганізацыям у іх падрыхтоўцы.

Партарганізацыя соўгаса ў барацьбе за высокі ўраджай

Соўгас імені 10-годдзя БССР, Любаньскага раёна, Мінскай абласці, канапляводчы. Але апрача канапель ён засявае больш 500 гектараў зернавых культур і кармовых траў, мае значнае пагалоўе жывёлы.

Партыйная арганізацыя соўгаса, якая складаецца з 16 комуністаў, правяла вялікую работу па мабілізацыі рабочага калектыва на правядзенне ўборкі ўраджаю без страт. Задоўга да пачатку жніва дырэкцыя соўгаса распрацавала і давяла да кожнай брыгады, цэха, агрэгата канкрэтны план уборачных работ. Комуністы і комсамольцы былі прымацаваны да адказных участкаў.

Планы папярэдне абмяркоўваліся на рабочых сходах. На гэтыя сходы былі запрошаны хатнія гаспадыні і служачыя соўгаса. У час уборкі яны разам з рабочымі дружна вышлі на палі і паказалі выдатныя ўзоры работы.

Планы, а таксама вынікі першых дзён уборачных работ абмяркоўваліся на адкрытым партыйным сходзе. Комуністы распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленню рашэнняў ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б). У поле, брыгады, цэхі пайшлі агітатары, каб раз'ясніць рабочым значэнне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б).

Перад уборкай комуністы праверылі работу сталовай соўгаса. У час жніва яна пачынала працаваць з 5 гадзін раніцы. У 6 гадзін рабочыя ўжо выходзілі на работу. Для аддаленых участкаў была арганізавана дастаўка харчоў у поле.

Усё гэта дало магчымасць убраць зернавыя культуры на працягу чатырох дзён. Соўгас выканаў сваю задачу — убраць збожжа без страт. Ні адзін сноп не прапаў. Сярэдні ўраджай жыта ў нас 22 цэнтнеры з гектара, ячменю — 20, аўса — 21. Думаем, што саломкі канапель будзе не менш 67 цэнтнераў з гектара.

На ўборцы выраслі рады стаханаўцаў. 67 чалавек штодня перавыконвалі норму выпрацоўкі. Трактарыст кандыдат ВКП(б) тав. Берднікові выпрацоўваў да 158 проц. нормы. Ад 132 да 167 проц. нормы давалі трактарысты тт. Раманоўскі, Кашлач, Комлік, Чарнагораў і іншыя. Па паўтары нормы давалі рабочыя Стась Брытвіч, Ольга Смірнова, Іван Крывальцэвіч, Вера Раманчук, Ольга Дубавік і іншыя.

Зараз у соўгасе наладжан круглясутачны абмалот і здача збожжа дзяржаве.

Першы экзамен вытрыман не дрэнна. Перад партарганізацыяй і ўсім калектывам соўгаса стаіць больш складаная задача — высокаякасна падрыхтавацца і ўбраць канопілі. Гэту задачу трэба выканаць на выдатна.

П. БАГУШЭЎСКІ,
парторг соўгаса імені 10-годдзя БССР.

Партарганізацыя віцебскай акулярнай фабрыкі правяла адкрыты партыйны сход па пытанню комуністычных адносін да працы. Зараз падрыхтоўваецца па гэтаму пытанню агульны сход калектыва фабрыкі. На здымку (злева направа): планавік К. Ф. Філіповіч, стаханавец Э. Л. Равін, эканаміст З. І. Пеўзнер і канструктар З. М. Ханін за падрыхтоўкай дакладаў да схода. Фото І. Лосева. (Фотахроніка БЕЛТА).

НА ТЭМЫ ДНЯ

ВЫСОКАЯКАСНА АПРАЦАВАЦЬ ЛЁН

Лён і канопілі — каштоўнейшыя тэхнічныя культуры. 288 тыс. гектараў пасеўнай плошчы нашай рэспублікі занята сёлета ільном і 18 тыс. гектараў засеяна канопілямі.

Совецкія ільнаводы навучыліся атрымліваць высокія ўраджаі ільну. Выдатныя экспанаты ільняной прадукцыі талачынскіх, лёзнянскіх, дрысенскіх і шклоўскіх ільнаводаў упрыгожваюць павільён Беларускай ССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Уключыўшыся ў социялістычнае спаборніцтва з ільнаводамі Калінінскай і Смаленскай абласцей, калгаснікі Совецкай Беларусі дабіваюцца яшчэ лепшых паказальнікаў у барацьбе за высокія ўраджаі ільну.

Але мала вырасціць добры лён. Трэба яшчэ своечасова ўбраць яго, добра апрацаваць, каб здаць дзяржаве валакно высокай якасці. Барацьба за высокую нумарнасць трасты і валакна, барацьба са стратамі на ўборцы і пры апрацоўцы ільну не менш адказная справа, чым, скажам, праполка або падкормка пасеваў. Гэта работа пачынаецца яшчэ ў полі і завяршаецца апошнім этапам апрацоўкі ільну—здачай адсартаванай трасты і валакна дзяржаве.

Кожнаму вядома, што нясвоечасовая ўборка ільну адбіваецца і на якасці і на колькасці атрыманага валакна і ільносемя. Аднак і на гэтым адказным участку не ўсё ў парадку. З 288 тыс. гектараў пасеваў ільну на 15 жніўня ўбрана толькі 156 тыс. гектараў.

На ільняных палях павінны працаваць 1.236 шыроказахватных ільноцерабілак МТС. У МТС дадаткова накіраваны навейшыя ўборачныя машыны «ВІСХОМ». Аднак тэмпы ўборкі незадавальняючыя. Па ўсходніх абласцях БССР план уборкі ільну машынамі МТС выканан толькі на 12 проц.

Уборка ільну павінна спалучацца з неадкладнай яго сушкай, абмалотам і рассцілам. Гэтага няма яшчэ ў радзе калгасаў. Каштоўны перыяд жнівеньскага рассцілу прахэдзіць. Практыка перадавых ільнаводаў Беларусі паказала, што жнівеньскі рассціл ільну — самы лепшы. Ён дае высокую якасць валакна, што вельмі важна і для нашай тэкстыльнай прамысловасці, і для калгаснікаў — здатчыкаў прадукцыі. Барацьба за жнівеньскі рассціл набывае асаблівае значэнне сёлета. Спазненне з рассцілам ільну ў мінулым годзе выклікала значнае зніжэнне нумарнасці трасты і валакна ў многіх раёнах, што ў сваю чаргу адбілася на аплаце ільняного працадня калгаснікаў.

Немалое значэнне мае выбар сцелішча. Лён нельга рассцілаць на іржышчы, лесу і каля самых рэк, дзе валакно крывацеецца іржой і з'ядаецца асеннімі манамі. На жаль, гэтага не хочуць мець у буйнейшым ільнаводчым Шоскім раёне. Больш палавіны ільну рассцілаюць па іржышчу. У Клецкім і Баранавіцкай абласці рассцілаюць па ільнянішчу, што бясспрэчна вядзе да якасці валакна.

Следам за рассцілам надыходзіць аборны перыяд у апрацоўцы ільну — мяцьбе і трапанне. І тут, як і ў іншых галінах сельскай гаспадаркі, на дапамогу земляробам мабілізавана совецкая тэхніка. Ужо ў мінулым годзе ў калгасах і МТС рэспублікі былі 1.053 ільнотрапальныя машыны Антонава, 174 ільнотрапальныя машыны Сяргеева. У калгасах працавалі 2.050 ільномялак, былі арганізаваны 1.782 ільносушыльныя пункты.

Праз тыдзень-другі ільноапрацоўчыя машыны павінны запрацаваць зноў. Ужо яны агледжаны і адрамантаваны. У Дубровенскім раёне налічваецца 63 ільноапрацоўчыя машыны Сяргеева і Антонава, з якіх больш палавіны не можа працаваць. Неадрамантаваныя машыны звалены пад навеці, і ніхто не падумаў, каб набыць да іх запасныя часткі. Няма ўпэўненасці, што своечасова пачнуць работу спраўныя машыны, бо для іх няма запасных рыхтаваных машыністаў.

Вялікую ролю адыгрываюць і сушкі. Між тым, іх у Рудзенскім раёне імкнуцца ператварыць у куратнікі. Агледжаныя і адрамантаваная сушня і нават дровы, патрэбнай якасці ў значнай меры спрыяюць атрыманню лепшага валакна. Трэба ж, складна агледзець сушні, абмазаць іх, дзе трэба, забяспечыць дровамі, набыць ліхтары для асвятлення.

Нельга забываць і пра такую акалічнасць, як нагляд за вылежваннем ільну на сцелішчах. Трэба, каб лён быў падняты са сцелішч своечасова.

Ужо цяпер неабходна падумаць аб шляхах сартыроўчышкаў ільняной прадукцыі, дабіваецца таго, каб на ільнозаводы трапляла здавалася выключна адсартаваная. У мінулым годзе на радзе ільнозаводаў Віцебскай абласці неправільна ацэньвалася ільнотраста, здаваемая калгасамі. Ці нецярпіма таксама, як і недапушчальна здача калгасамі гнілой, нядобраякаснай трасты.

Здаць дзяржаве валакно і трасту высокай якасці — абавязак усіх ільнаводаў. Узорнай арганізацыяй работы на мяльніцах, разгортваннем спаборніцтва між звенямі, брыгадамі і калгасамі б'ємся высокаякаснай апрацоўкі і здачы дзяржаве ільняной прадукцыі новага ўраджаю!

ПАДРЫХТАВАНА СУСТРЭНЕМ ВУЧЭБНЫ ГОД

Менш дзесяці дзён аддзяляюць нас ад новага вучэбнага года. У Валожынскім раёне, як і ва ўсіх раёнах заходніх абласцей БССР, надыходзячы вучэбны год сустракаецца з асаблівай радасцю, бо мы прыходзім да яго сёлета ва ўмовах шчаслівай совецкай рэчаіснасці.

У раёне праведзена значная работа па падрыхтоўцы школьных будынкаў. Ужо закончана перабудова пад школы 35 былых асаблівіцкіх дамоў, у якіх будуць вучыцца 3.700 дзяцей. У 14 школах праведзен бягучы рамонт: тынкаванне, пабелка і інш.

Совецкія школы — прасторныя, светлыя, чыстыя. Для прыкладу можна прывесці пачатковую школу ў вёсцы Аляпава, якая мае 4 прасторныя класныя пакоі і пакой для настаўніка. Такіх школ—большасць.

Пры ўладзе польскіх паноў дзеці працоўных і не марылі аб такіх школах. Нават былыя так званыя «маршалкоўскія» школы ў вёсцы нагадвалі ўбогія халупы. У в. Забрэзе «маршалкоўская» школа на 350 вучняў мела толькі 3 класныя пакоі. У вёсцы Навасёлкі для 280 вучняў была збудавана школа з 2-х класных пакояў.

Зараз у той-жа вёсцы Забрэзе і школы дабудаваны 4 класныя пакоі, а Навасёлках—5. Пабудавана многа і іншых школ. Амаль усе вясковыя школы пераведзены з сялянскіх хат у спецыяльныя будынкі.

Школы амаль поўнасцю забяспечаны апалам. З патрэбных 5.300 кубаметраў дроў ужо дастаўлена 4.000 кубаметраў.

Заканчваецца таксама падрыхтоўка абсталявання школ—школьных парт, сталоў, класных дошак, шафаў. З райсаюзам заключан дагавор на дастаўку наглядных дапаможнікаў на суму 54.000 руб. Нехапае падручнікаў для III і IV класаў па геаграфіі, гісторыі і прыродазнаўству. Не поўнасцю забяспечаны яшчэ падручнікамі і вучні старэйшых класаў.

Горш справа пакуль што з настаўніцкімі кадрамі. Праўда, курсы, якія былі арганізаваны для мясцовых настаўнікаў, адыгралі вялікую ролю ў падняцці іх кваліфікацыі. Але ў сувязі з ростам сеткі школ нехапае ў раёне каля 80 настаўнікаў малодшых і старэйшых класаў. Наркомасветы БССР павінен прыняць меры да забеспячэння школ настаўнікамі.

Марудзіць Наркомасветы БССР і з прысылкай у школы раёна класных журналаў і вучнёўскіх дзённікаў. Яны павінны быць атрыманы своечасова.

Сёлета ў нашых школах ёсць усе магчымасці, каб новы вучэбны год сустрэць у поўнай гатоўнасці.

П. ТАРАСІК,
загадчык Валожынскага райана.
П. БІТЭЛЬ,
інспектар-метадыст.

Абавязацельствы выкананы

Дагэрмінова выканаць план здабычы торфу—такое абавязацельства ўзяў на сябе калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых торфзавода «Лукское», Жлобінскага раёна. Абавязацельства не асталося на паперы. 13 жніўня завод выканаў свой сезонны план на 100,3 проц.

Такога бліскучага поспеху мы дабіліся дзякуючы ўзорнай рабоце стаханаўцаў і стаханавак, якія па-большэвіцку змагаліся за выкананне плана.

Стаханаўская брыгада тав. Новікава на элеватарна-ваганетачнай машыне выканала свой план на 30 дзён раней тэрміну.

Добрых вынікаў дабілася брыгада тав. Шкудрова. Свой план яна выканала на 122,7 проц.

Стаханаўкі тт. Гацько і Касцейкова выконваюць свой план на сушцы і штабялёўцы торфу на 200 і больш проц. Рабочы калектыў абавязаўся да канца сезона здабыць дадаткова яшчэ 8 тысяч тон торфу.

МЯДЗВЕДЗЕЎ,
дырэктар торфзавода «Лукское».
РУДКОЎСКІ,
сакратар партарганізацыі.

БУДЗЁНАЎЦЫ

З раёна на двух грузавіках прыехалі комсамольцы на чале з сакратаром райкома комсамола, і яшчэ дружней пайшла ўборка снапоў.

Хораша цяпер у полі. Цвіце грэчка, выспяваюць аўсы, лапушыцца бульбоўнік. Паабапал дарогі стаяць снапы, састаўленыя ў бабкі.

— Усё, што тут відаць,—гаворыць сакратар райкома, наглядаючы ў далечыню, — было пана Крукскага. І той лес, і лугі, і поле былі панскімі.

Зараз тут зямля калгасаў імені Сталіна і імені Будзённага. Гаспадарамі тут сяляне, былыя панскія нявольнікі, людзі, якія толькі нядаўна ўпершыню свабодна ўздыхнулі ў гэтым мядзяным шолаху спелых ніў, цяністых бораў.

Машына імкліва нясецца па прасёлачнай дарозе. Павозкі, нагружаныя-снапамі, астанаўліваюцца, коні стрыгуць вушамі, фыркаючы ў ноздры. Людзі пазнаюць райкомаўскую машыну, весела ўсміхаюцца, махаюць шапкамі.

— Жара,—гаворыць шофер і спішае ход каля старога мосціка. На ўзбярэжжы вузенькай ракі пасвяцца каровы. Нахіліўшыся над рэчкай, пастушок прыгаршчамі п'е ваду.

— Што за рэчка?—пытаем у пастушка.

— Сула,—гукае пастушок.

І перад намі зноў паўстаў у памяці невясёлы малюнак, успомніліся словы:

А там, за Сулай, па той бок граніцы,
Дзе звесілі дзюбы панура арлы...

На полі калгаса імені Будзённага многа фурманак. Жанчыны, мужчыны, падросткі завіхаюцца, паглядаючы ў бок цёмнага бора, адкуль ціха, не спяшаючыся выплывае сівая, набухшая вадой, хмара. І людзі рашылі не святкаваць нядзелю, не даць дажджу паліцца на сухія бабкі снапоў.

Не выходзіў на ўборку толькі стары Кавальчук Пятрук. Чалавек ён набожны і аўтарытэтны сярод сваіх аднагодкаў-старыкоў. Стаяў ён абапёршыся на плот і глядзеў як хмара абкладала неба. Да яго падыходзілі такія-ж сівыя, басаногія ў расхрыстаных кашулях старыкі і дымілі люлькамі.

— Навошта вы тут бадзяецеся? Вось чэрці!—не вытрымаў Пятрук. І схапіўшы граблі, вышаў з прадгумення.

Снапы былі звезены да дажджу, і ўвечары імёны Кавальчука і іншых старыкоў красаваліся на чырвонай дошцы за ўдарную працу.

Каля самай прасёлачнай дарогі, непадалёку ад вёскі стаіць хата Палешука Васіля. Двор яго адгароджан густым частаколам. Над паламанай страхой навісаюць старыя клёны. Васіль Паляшук стаіць нібы заліты сонцам, пазіраючы на сумны і маўклівы лес. Ён—гаспадар гэтага лесу. Праўленне калгаса вылучыла яго лясным вартаўніком. 600 гектараў сасны і бярозы даверылі яму.

— Займай, Васіль, хату былога стражніка і пільнуй наш совецкі лес,—сказалі яму ў канторы калгаса. І Васіль Паляшук з таго часу жыве тут і пільнуе совецкі лес.

Вось ён стаіць ля варот і з дзелавітай важнасцю паглядае ў далеч прасёлачнай дарогі, па якой ледзь кратаецца, набліжаецца фурманка.

...Побач з мышастым конікам, крок у крок—селянін у паношаным шарачку. На возе ляжаць круглякі, прыкрытыя яловымі лапкамі.

— Еўсей, — гаворыць Паляшук, калі воз пад'ехаў да варот,—пілаваць на дошкі вязеш, ці што?

— Ага, — сказаў селянін, прыпыняючы каня,—школа будуецца ў Ячонках, а мне заработкі... Дзесяць класаў будзе. Сапраўдная гімназія.

— Сапраўдная, кажаш?—прыжмурыўшы вока, Паляшук акінуў воз і, заўважыўшы сырыя арэхавыя пруты, спытаў: —А палкі навошта школе?

— Гэта я на абручы вязу, кадушка лопнула. Адно няпчасце. Заплаціць за палкі, ці як?

— У калгас трэба ўступаць,—гаворыць Паляшук, — ну, тады іншы сказ. А тут кожны так, на калгаснае пацягнецца, —не адказваючы на пытанне селяніна сказаў ён.—Што-ж ты, Еўсей,— павысіў ён голас, — сам сябе абкрадаеш? Як той адшчэпенец, адбіўся ад людзей.

— Баюся не разгубіцца. Сям'я малая, клопатаў менш.

— Сям'я вялікая, сіла вялікая. А ты — адуванчык: махнуў — і няма цябе. Адзін у полі не воін.

— Зямлю я люблю... Шкадую зямлю. І каня шкада.

— А хто-ж табе даў зямлю?

— Советы.

— А каня?

— Советы.

— А кім ты быў?

— Панскім парабкам.

— Батраком у пана Крукскага. Совецкая ўлада зрабіла цябе гаспадаром. Совецкая ўлада цябе не пусціць у крыўду.

— Я падумаю...

— Падумай,—паўтарыў Паляшук. — Чуеш, як гудзе? Калгас малоціць. Матарамі малоцяць, трактарам аруць.

...З-за прысадаў, ледзь крапутых асенняй пазалотай, даносіцца гул малатарняў, за пагоркам ракочуць трактарныя маторы. Селянін у шарачку, цмокнуўшы губамі, сцебануў каня пугай.

— Дык падумай, Еўсей, лабра жадаю, —сказаў Паляшук удагонку і, звярнуўшыся да нас, паясніў:

— Мой шурын. Цёмны чалавек. Век быў без зямлі, без каня, дык зараз прыляпіўся да зямлі як клешч: індывідуалам хачу, кажа, пажыць. А якое там жыццё, калі ў чалавека няма ані гумна, ані хлява, ані свірна. Конь ды зямля, ды хаціна...

І Паляшук пачаў расказваць, які быў люты іх пан і як ён адзекваўся над людзьмі.

— Возьме, бывала, пан стрэльбу, ходзіць па вёсцы, падсвінкаў і курэй сялянскіх страляе: люблю, кажа, суп са свежай курацыны.

Потым Паляшук расказаў, як пан вераснёўскай раніцай ціхенька, як той канакрад, пакінуў маёнтак, як прышло чырвонае войска.

— Некаторыя з нашай вёскі ў дні грамадзянскай вайны разам з Будзённым білі белых афіцэраў. І вось зараз у нашай вёсцы калгас. І называецца ён іменем Семёна Міхайлавіча Будзённага.

***

Дзіўная вячэрняя цішыня разліта ў паветры і як быццам чуеш, як звіняць праменні вячэрняга сонца. Чырвоныя вяршыні тапалёў падымаюцца над прысадамі сініх вербаў і гараць як свечкі.

У вёсцы Ждановічы ў гэты час пахне варанай бульбай і сырадоем. Член сельсовета Касавыр Лейба з кніжкамі, са скруткам газет праходзіць уздоўж вуліцы, падымаецца на ўзгорак да новай хаты, дзе яго чакаюць аднасяльчане.

Людзі сядзяць на новых струганых бярвеннях і курацъ. Пры набліжэнні Лейбы некаторыя ўздымаюцца з бярвенняў, уступаюць месца.

— Нічога, не турбуйцеся, я тут з краю прысяду,—гаворыць Лейба і садзіцца на тоўстае бервяно.

Лейба Касавыр—хлебароб гэтай-жа вёскі. Мае каня, карову, сваю хату. Чалавек ён актыўны, сумленны. На агульным сходзе аднасяльчане выбралі яго членам сельсовета. Не так даўно ён скончыў раённыя курсы агітатараў. І зараз кожны вечар Лейба праводзіць гутаркі з сялянамі на розныя хвалюючыя тэмы.

У гутарку паступова ўцягваюцца ўсе слухачы.

— Ад сястры я атрымаў пісьмо,—расказвае селянін Батдановіч Іван. — Яна жыве ў Копыльскім раёне, у калгасе імені Сталіна. Дык піша, што яшчэ і зараз стары хлеб ёсць. Па два кілограмы адной пшаніцы атрымалі на працадзень, ды па 10 кілограмаў бульбы. Жывуць у поўным дастатку.

— Нашы суседзі з калгаса імені Варашылава, — гаворыць Лейба, — ужо ўборку закончылі. Хутка закончаць абмалот. З дзяржавай таксама разлічыліся. Трэба спяшацца з уборкай і хлебаздачай і нам.

— Лейба правільна гаворыць.

— Мы,—прадаўжае Лейба,—павінны ісці па шляху, указанаму Леніным і Сталіным, і тады пойдзем угару, пабудуем такое жыццё, што адна любата...

І сэрца радуецца, калі глядзіш на гэтых вольных людзей, якія жывуць новымі ідэямі, новымі перспектывамі, людзей, якія адчулі сябе поўнапраўнымі гаспадарамі жыцця.

А. БЯЛЕВІЧ.

Стаўбцы.

Па-большэвіцку весці барацьбу з дэзарганізатарамі вытворчасці і іх патуральнікамі!

РАСТРАТЧЫКІ РАБОЧАГА ЧАСУ

ГОМЕЛЬ. (Ад нашага карэспандэнта). даных упраўлення справамі аблз. работнікі прыходзяць на работу аку на, прагулаў і спазненняў няма. Фар ьна ўсё абстаіць добра. Але варта глядзецца ла работы асобных супра нікаў, каб стала ясна, як гранжырваецца каштоўны рабочы час. іраўнікі аблз сочаць за тым, каб отнікі ўстановы праседжвалі «ад—да». не турбуюць прагулкі па карыдору, жаны з аддзела ў аддзел, пастаянныя мовы ў час работы.

У пакоі захоўнага тэрытарыяльнага раўлення многа сталоў, амаль за кож м сядзіць па два работнікі. У па канні шум і гам. Раптам у пакой тае хлопчык. Ён на ўвесь голас заяў , што ў буфет прыбылі баранкі. Усе уць у буфет і праз 15—20 мінут таюцца з вязкамі баранак. Пасля гэ а пачынаецца проба якасці прадукцыі самым цэнтры, за вялікім сталом ся ць начальнік упраўлення тав. Грама . Ён спакойна наглядае за ўсёй гэтай най і не рэагуе на грубыя парушэнні цоўнай дысцыпліны.

Фатаграфія рабочага дня кіраўніка гру кок-сагыза тав. Хургіна паказала. гэты чалавек акуратна прыходзіць і лзіць з работы, а на карысную спра траціць усяго толькі 2—3 гадзіны ў нь.

У паліўным аддзеле працуе экспаніміст роўская. Яна толькі тым займаецца ляніва перагортвае паперы або алае нейкія табліцы, у якіх няма ні й патрэбы.

На кіраўніка справамі тав. Грыдзіну лазен абавязак сачыць за своечасо м уходам і прыходам на работу, яна зе і ўлік ад'езду і звароту з каманды ак. Цікава, што Грыдзіна сама груба ушае дысцыпліну. На прыватныя тэ онныя гутаркі яна траціць шмат ча У яе пакоі часта можна бачыць гру работніц, абмяркоўваючых у рабочы розныя сямейныя справы.

Нават даручаную ёй работу — вя нне табеля — Грыдзіна выконвае ня расумленна. 19 жніўня 16 супрацоў аў пасля сканчэння работы не знялі іх нумароў, але ніхто не заўважыў ага.

У абласным зямельным аддзеле фар ьна арганізаван улік каманды ак. Чым займаюцца супрацоўнікі ў анцыроўках — за гэтым ніхто не со ць.

Нельга сказаць, што мясцком упраў ня не займаецца пытаннем працоўнай цыпліны. 12 ліпеня адбыўся тут, па ражанню старшыні мясцкома тав. Но ава, бурны сход. Мы азнаёміліся з таколам гэтага сходу. Ён напісан на залатках паперы. Абмяркоўвалася пы не **«аб упарадкаванні работы буфе —нарушальніка працоўнай дысцыпліны» (!?).** Незразумела, хто з'яўляецца на пальнікам працоўнай дысцыпліны — фет, ці хто іншы? Аб'ектам крытыкі, зваецца, была буфетчыца, якая, да ны, не прысутнічала на гэтым сходзе. яе абрушыліся ўсе выступаўшыя амоўны, у тым ліку сакратар партый га бюро тав. Алмазаў. Сход пралаў ўся тры гадзіны, але пасля яго па лек ва ўстанове нікольні не палеп ўся.

Начальнік абласнога зямельнага аддзе тав. Астроўскі і сакратар партыйнага ро тав. Алмазаў не заўважваюць ча сці непалалкаў, панўючых у даверан ім установе.

Н. ГІРШЫН.

Казакоў і яго апекуны

Ужо даўно пачаўся рабочы дзень у мінскай школе медыцынскіх сясцёр і лабарантаў.

— Ці можна бачыць дырэктара? — звярнуўся адзін з наведвальнікаў да сакратара школы Слесарэвіч.

— Дырэктар яшчэ не прыходзіў, — паследваў адказ.

— А калі будзе?

— Не ведаю, ён мне не дакладвае.

— У мяне неадкладныя справы. Вы разумееце — неадкладныя, некалькі дзён хаджу і ўсё без вынікаў. Скажыце, калі-ж ён бывае ў школе, калі яго можна знайсці? — настойваў наведвальнік.

— Я вам адказала, што Казакова няма, а калі ён будзе, гэта яму ведаць, па тое ён і дырэктар.

І сапраўды, 9 ліпеня дырэктар не прыняў нікога з выкладчыкаў і наведвальнікаў. Цэлы дзень ён нават не з'яўляўся ў даверaную яму ўстанову.

Калі скончыўся рабочы дзень і комуністы сабраліся на партыйны сход, раздаўся тэлефонны званок. Заплятаючымся языком дырэктар школы, член партыі Казакоў прамармытаў, што ў яго дома здарылася бяда і па гэтай прычыне ён па сходзе быць не можа.

А на наступны дзень выяснілася, што Казакоў не з'явіўся на работу і на партыйны сход таму, што быў п'яным. Яго выкрыла інспектар мінскага абласнога аддзела аховы здароўя тав. Міравая.

Прыпёрты, як гаворыць, да сцяны бясспрэчнымі фактамі, Казакоў заявіў на партыйным сходзе, што сапраўды 9 ліпеня ён сустрэўся з прыяцелямі з Беластока і ў сувязі з гэтым прышлося выпіць. Як не адзначыць нечаканую сустрэчу! Таму ён і не мог з'явіцца ва ўстанову і на партыйны сход. Што і гаварыць — прычына ўважлівая!

Сакратар первічнай партыйнай арганізацыі т. Зарэцэр у сваім выступленні патрабавала прыцягнення Казакова да ад каснасці, як злоснага нарушальніка працоўнай дысцыпліны, п'яніцу і прагульшчыка. Яна паведаміла, што Казакоў на работу наогул з'яўляецца, калі яму ўздумаецца, нярэдка ў падазрона вясёлым настроі.

Разгарэліся спрэчкі, як лічыць учынак Казакова, зроблены 9 ліпеня, — прагулам ці не. З прамоваю, падобнай на лекцыю аб маралі, выступіў на сходзе загадчык аддзела кадраў абласнога аддзела аховы здароўя т. Эйдлін.

— Кожны крок дырэктара, — сказаў ён. — мае значэнне. Студэнты бачаць у асобе дырэктара кіраўніка ўстановы, свайго выхавацеля. Дырэктару не да твару быць прагульшчыкам і п'яніцай.

Пажурыўшы крыху Казакова, Эйдлін заключыў, што ўсё-ж можна пакуль пакінуць яго на пасадзе дырэктара, устанавіўшы штодзённы кантроль за работай школы з боку абласнога аддзела аховы здароўя.

У спрэчках выступілі і іншыя комуністы, і паколькі іх думкі разышліся, у рашэнні запісалі:

«У сувязі з тым, што ў часе абмеркавання пытання аб п'янстве т. Казакова паднята пытанне аб прагуле адначасова з п'янствам, які недастаткова выяснен, аддкласці канчатковае рашэнне пытання да наступнага схода, які склікаць заўтра, г. зн. 11 ліпеня на 13 гадзін».

На гэты раз на партыйны сход, назначаны ў рабочы час, кансультантамі, закліканымі кваліфікаваць учынак Казакова, прышлі выконваючы абавязкі загадчыка абласным аддзелам аховы здароўя Нейштат, вядомы нам ужо загадчык аддзела кадраў абласнога аддзела аховы здароўя Эйдлін і інструктар Варашылаўскага РК КП(б)Б Андрэева. Усе яны выступілі з прамовамі. На жаль, сценаграма іх прамоў да нас не дайшла.

Пад уплывам аўтарытэтных дарадчыкаў партыйны сход, нарэшце, прыняў рашэнне. У ім запісана: «За ігнараванне партсхода і выпіўку 9 ліпеня 1940 г. тав. Казакоў заслугоўвае партыйнага спагнання, але, улічваючы, што т. Казакоў прыязнае сваю памылку, абмежавацца папярэджаннем».

Як сцвярджае тав. Андрэева, аб гэтым рашэнні партыйнага схода яна паведаміла сакратарам Варашылаўскага райкома КП(б)Б. Але яны, як відаць, задаволіліся такім «удалым» зыходам справы.

Тым часам злосны дэзарганізатар працоўнай дысцыпліны Казакоў яшчэ больш распаясаўся, стаў на шлях прамога сабатажу Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Ён пачаў цэлымі днямі не бываць ва ўстанове. Прыкладу Казакова следуюць і іншыя работнікі. Калі раней галоўны бухгалтар школы Зысман прыходзіў ва ўстанову хоць бы па гадзіну-дзве ў дзень, то ў апошні час ён палічыў магчымым зусім не з'яўляцца.

Як выяснілася, Зысман умудраецца адначасова быць галоўным бухгалтарам у двух установах: у школе медыцынскіх сясцёр і ў першай совецкай больніцы. У першыя дні пасля Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета Зысман рэгулярна прыходзіў у 1-ю совецкую больніцу, адзначаўся ў табелі і пасля, як ён гаварыў, паведваў па службовых справах гарадскія ўстановы. У гэты час ён прыязджаў у школу медсясцёр і лабарантаў, адзначаўся ў табелі, даваў указанне картатэтчыцы і таксама адбываў «у гарадскія ўстановы па службовых справах».

Усю бятучую бухгалтарскую работу ў школе доўгі час вяла адна са студэнтак, эразумела, за плату. Зысман толькі быў яе настаўнікам і за гэта атрымліваў стаўку галоўбуха.

Калі дырэктар школы Казакоў стаў сабе дазваляць днямі не прыходзіць на работу, галоўны бухгалтар Зысман рашыў рабіць тое-ж. Чым ён, скажам, горшы за дырэктара? Праца-ж у яго не нарміраваная.

Аднойчы тэхнічны сакратар школы Слесарэвіч паведаміла Казакову, што Зысман падрад тры дні не з'яўляецца ва ўстанову, і яна ў табелі запісала яму прагулы. Слесарэвіч асмелілася сказаць, што такія-ж прагулы лічацца за дырэктарам.

— Вы мне гэтыя фокусы не рабіце,— як ужалены закрычаў дырэктар, — які такі табель вы ўздумалі весці, ніякіх табеляў нам не трэба.

— Не трэба, дык не трэба, — пакорліва адказала сакратар.

Вальтэтнае жыццё настала для лодыраў у школе медыцынскіх сясцёр і лабарантаў. Дырэктар на работу не з'яўляецца, адказнасці за даручаную справу ніхто не патрабуе, на работу можна прыходзіць калі ўздумаеш, пакідаць установу—калі захочаш. Табель-жа не вядзецца.

Вось ужо трое сутак дырэктар не паказваецца ў школе па той прычыне, што занят клопатамі, звязанымі з падрыхтоўкай да ад'езду ў службовую камандыроўку. Як-жа, трэба аддаць адказны візіт прыяцелям з Беластока.

Так пры патуранні абласнога аддзела аховы здароўя абнаглеўшы дэзарганізатар працоўнай дысцыпліны Казакоў развальвае работу даверанай яму назучальнай установы, сабатуе выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

В. ФЕСЬКО.

ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ РЭСПУБЛІКІ

ПЕРАДАВАЯ БРЫГАДА

У першым цэху мінскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» вывешана дошка соцыялістычнага спаборніцтва. На ёй штодзённа адзначаюцца колькасныя і якасныя паказальнікі работы кожнай брыгады.

— Хто-ж сёння ўзяў першынства?— цікавяцца рабочыя, сабраўшыся ля дошкі.

Рабочыя брыгады тав. Фельдман абавязаліся ліквідаваць прагулы і спазненні на работу, максімальна ўшчыльніць рабочы дзень, заваяваць першынства ў выкананні вытворчага плана. Свае абавязацельствы яны з чэсцю выконваюць. На працягу ўсяго ліпеня не было ні аднаго прагулу і спазнення. У жніўні работніца Жураўская аднойчы спазнілася на 5 мінут. Гэта выклікала агульнае абурэнне рабочых. Пытанне аб яе спазненні спецыяльна абгаварвалася на агульным сходзе брыгады. Усе выступаўшыя адзначалі, што Жураўская нарушыла дагавор і тым самым ганьбіць усю брыгаду. Нарушальніца працоўнай дысцыпліны абавязалася больш спазненняў не рабіць. І сваё слова Жураўская стрымала.

Брыгадзір тав. Фельдман заўсёды папярэджвае рабочых, каб яны выключна ўважліва сачылі за сваёй аперацыяй.

— Вучыцеся працаваць у стаханавак Пражэвальскай, Стэльмах, Шыргароцкай, — раіць брыгадзір усім рабочым.

У гэтых людзей сапраўды ёсць чаму павучыцца. Яны рацыянальна скарыстоўваюць кожную секунду рабочага часу, даюць прадукцыю высокай якасці. Менш 180 проц. зменнага задання ў іх ніколі не было.

Настойлівая работа дала добрыя вынікі. З дня заключэння новага дагавора не было ні аднаго выпадку, каб брыгада выпусціла брак.

На дошцы ў графе брыгады тав. Фельдман стаіць лічба «119,8». Гэта процант сярэдняй выпрацоўкі брыгады за прайшоўшыя дні жніўня і самая высокая лічба на фабрыцы.

НІ АДНАГО ПРАГУЛУ

На барысаўскай макаронай фабрыцы імені Леніна ёсць змена «Комунар». Начальнікам яе працуе тав. Вышэдка. Калектыў змены з вялікім уздымам узяўся за работу па-новаму. Гістарычныя Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня з'явіліся магутным сродкам барацьбы за высокапрадукцыйныя 480 мінут, за захаванне тэхналагічнага працэса і санітарнага мінімума на вытворчасці.

З дня апублікавання Указа ў змене не было ні аднаго выпадку прагулу або спазнення. Новая норма выпрацоўкі — 15,9 тоны макарон за змену—сістэматычна перавыконваецца на 4—5 тон. Павысілася і якасць выпускаемай прадукцыі. Макарон першага сорта павінна быць па плану выпушчана за змену 75 проц., а выпускаецца 78,9 проц.

Стаханавец-прэсаўшчык т. Кучынскі выпрацоўвае 20 тон макарон сырых поўфабрыкатаў замест 15 тон па плану. Ён беражліва адносіцца да абсталявання, прытрымліваецца ўсіх правіл санітарыі. Укладчыца гатовых вырабаў Белановіч выконвае новую норму на 135 проц., брыгадзір упаковачнага цэха Французенка Марыя дабілася высокай прадукцыйнасці ў сваёй брыгадзе, за што атрымала пахвальную грамату Наркамхарчпрома СССР.

Добрая работа начальніка змены тав. Вышэдка і прафорга Панкратава забяспечыла ажыццяўленне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб працоўнай дысцыпліне і якасці прадукцыі.

Здача збожжа дзяржаве калгасам «Чырвоная зорка», Мазырскага раёна, на базе Заготзярно. Фото І. Аўруцкага. (Фотахроніка БЕЛТА).

ВЫДАТНА ПРАВЕСЦІ СЯЎБУ АЗІМЫХ

Сёлета калгасы Мінскай вобласці павінны засеяць 195.460 гектараў азімых, у тым ліку 22.625 гектараў азімай пшаніцы. Азімыя культуры з'яўляюцца найбольш ураджайнымі ў параўнанні з яравымі і маюць велізарнейшае значэнне ў барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) аб штогоднім зборы 8 мільярдаў пудоў зярна.

Рад перадавых калгасаў і раёнаў Мінскай вобласці па-большэвіцку падрыхтаваліся да сяўбы азімых. Калгас «Піонер», Копыльскага раёна, загадзя падрыхтаваў глебу, выкупіў і вывез пад азімыя 63 тоны мінеральных угнаенняў. Калгасы Пухавіцкага раёна ўжо ўзмяшалі пад азімыя 5.200 гектараў з агульнай плошчы 7.300 гектараў. Пад азімыя вывезена 16.500 вазоў гною.

Калгасы Мінскага раёна павінны засеяць азімымі 12.600 гектараў. На поле вывезена 11.000 вазоў гною, узмешана 9.070 гектараў папару. Цалкам падрыхтаваліся да сяўбы азімых калгасы Кайкаўскага сельсовета. Яны ўгнаілі ўвесь азімы клін і забяспечылі сябе высокаякасным насеннем.

Аднак у цэлым па вобласці падрыхтоўка да сяўбы праходзіць зусім нездавальняюча. Асабліва адстаюць Бягомльскі, Халопеніцкі, Крупскі і Заслаўскі раёны. Гэтыя раёны кожны год позняцца з сяўбой азімых культур, не вытрымліваюць двухэкаднага тэрміну для перапасеўнай асадкі глебы, не выконваюць планаў вывазкі мясцовых і мінеральных угнаенняў, сеюць нескандыцыйным зярном. У выніку яны збіраюць самы нізкі ўраджай азімых культур.

Каб забяспечыць двухэкаднае асядание глебы перад пасевам і не дапусціць вымярзання азімых, трэба неадкладна ўбрань яравыя пасевы з занятых папараў і плошчу ўзараць плугам з прадплужнікам на поўную глыбіню пахатнага гарызонта.

Поспех барацьбы за высокі ўраджай азімых культур залежыць не толькі ад добрай і своечасовай апрацоўкі глебы. Калгасы нашай вобласці павінны вывезці пад азімыя 3.000.000 вазоў гною. Вывезена-ж усяго 100.000 вазоў. Крупскі, Чэрвеньскі, Смалявіцкі, Чырвонаслабодскі і Старобінскі раёны нават не браліся за вывазку гною пад азімыя.

Мала вывезена і мінеральных угнаенняў. На складах сельгасхімснаба ляжыць нявывезеных фасфарытных угнаенняў 2.190 тон, калійных—1.669 тон, калчаданнага агарка—344 тоны, азотных — 43 тоны. Калгасамі Любаньскага раёна не вывезена 997 тон угнаенняў, Пухавіцкага — 615 тон, Плешчаніцкага — 349 тон. У вобласці няма такога раёна, які-б цалкам вывез і скарыстаў пад азімыя культуры ўсе мінеральныя ўгнаенні.

Ураджай азімых у значнай меры залежыць ад якасці насення. Для выканання плана сяўбы павінна быць загадзя намалочана, ачышчана і праверана ў кантрольна-насенных лабараторыях 31.112 тон азімага жыта і 4.300 тон азімай пшаніцы.

Машынна-трактарныя станцыі Мінскай вобласці маюць 400 складаных малатарань МК-1100 і 244 малатарні МО-900. Калі даць поўную сутачную нагрузку гэтым малатарням, то яны з поспехам намалоцяць зярна як для выканання плана зернапаставак, так і для насення. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што ў калгасах вобласці ёсць 3.000 конных малатарань, якія таксама павінны быць уключаны ў работу.

У мінулым годзе толькі 28 проц. азімых было пасеяна радковым спосабам. Між тым, мы маем усе ўмовы для таго, каб пасеяць іх выключна радковымі сеялкамі. У МТС вобласці ёсць 772 трактарныя сеялкі, а ў калгасах — 900 конных сеялак. Калі ўсе гэтыя сеялкі поўнасцю скарыстаць на сяўбе, калі кожнай трактарнай сеялкай засяваць у суткі 15 гектараў, а конай—5 гектараў, то ўся сяўба будзе закончана за 13 дзён. Значыць, задача заключаецца ў тым, каб нагрузіць усе сеялкі, замацаваць іх за лепшымі трактарыстамі і калгаснікамі.

У мінулыя годы калгасы Мінскай вобласці зацягвалі сяўбу азімых. У выніку гэтага частка пасеваў ішла пад снег неакрэпшай і вымярзала. Сёлета сяўбу азімых культур рэкамендуецца правесці з 20 жніўня па 5 верасня.

У кожным калгасе трэба загадзя вызначыць насенныя ўчасткі пад пшаніцу і жыта, добра іх апрацаваць, угнаіць і засеяць выключна радковым спосабам.

У мэтах поўнай ліквідацыі галаўні трэба пратравіць насенне. Для знішчэння пыльнай галаўні зярно, высяваемае на насенных участках, трэба пратравіць тэрмічным спосабам.

Узорнае правядзенне сяўбы азімых пры поўным захаванні ўведзеных правільных севаабаротаў і прымяненні ўсяго комплекса аграмерапрыемстваў забяспечыць калгаснікам высокі сталінскі ўраджай у 1941 годзе.

І. Х. МАРКАЎ,
галоўны аграном Мінскага облземаддзела.

Вайна ў Афрыцы

З часу ўступлення Італіі ў вайну афрыканскі мацярык апынуўся таксама ў сфеце ваенных дзеянняў. У зводках генеральных штабаў ваюючых краін замільгалі паведамленні з Лівіі, Кірэнаікі, Егіпта, Абісініі, Джыбуці, Англа-Егіпецкага Судана, Кеніі, Уганды, Паўднёва-Афрыканскага Саюза, Італьянскага і Брытанскага Самалі.

Наступленне італьянскіх войск на Брытанскае Самалі, пачатае ў першых числах жніўня, з'яўляецца сур'ёзнай пагрозай англійскім камунікацыям у Красным моры і Індыйскім акіяне. Італьянцы заняважныя пункты—Эгейса і Одуэйн—пункты Брытанскага Самалі. Незадоўга да гэтага яны ўступілі ў порт Зейла на узбярэжжа Адэнскага заліва. Прадаўжаюцца бамбардыроўкі Адэна. Упорны характар прымаюць баі на ўзвышшах і ля гор, якіх праходаў на шляху да Краснага мора. Усе гэтыя аперацыі цесна звязаны з ваеннымі дзеяннямі ў іншых частках Афрыкі, у якой знаходзяцца шматлікія калоніі Англіі і Францыі.

Паражэнне Францыі—гэтай другой у свеце каланіяльнай дзяржавы—паставіла пытанне аб лёсе яе афрыканскіх калоній. Набліжэнне ваенных дзеянняў да граніц Іспаніі ажывіла іспанскія прэтэнзіі на каланіяльную экспансію ў Паўночнай Афрыцы.

У гэтай сувязі прадстаўляецца небесцікавым разгледзець пытанне аб тым, якія былі варожых бакоў на афрыканскім мацерыку.

Трэба адзначыць перш за ўсё, што да гэтага часу Германія не прымае ўдзелу ў ваенных дзеяннях у Афрыцы. Удзельнікамі ваенных аперацый з'яўляюцца Англія і Італія.

Італьянскія ваенныя сілы сканцэнтраваны галоўным чынам у Усходняй Афрыцы. Тут Італія мае (у Абісініі і прылягаючых да яе італьянскіх калоніях Самалі і Эрытрэі) армію, прыкладна, у 200.000 чалавек, створаную яшчэ ў 1935—1936 г. Гэтая армія па свайму аснашчэнню з'яўляецца адной з нямногіх на афрыканскім мацерыку. Яна мае сучаснае ваеннае снаражэнне. Слабасць Італіі заключаецца ў тым, што сувязі паміж італьянскімі ўладаннямі ў Паўночна-Усходняй Афрыцы, з аднаго боку, і метраполіяй, з другога—перарэзаны. Шлях з Італіі ў Эрытрэю і Абісінію вядзе праз Суэцкі канал, які знаходзіцца пад кантролем Англіі.

Трэба ўказаць, што Італія прадугледзела магчымасць разрыву камунікацый паміж італьянскай Паўночна-Усходняй Афрыкай і метраполіяй. Яшчэ за два тыдні перад уступленнем Італіі ў вайну яна заключыла пагадненне з Японіяй, якое прадугледжвае згоду Японіі забяспечваць італьянскую Усходнюю Афрыку ўсім неабходным.

Італьянскім сілам на паўночным усходзе Афрыкі Англія процістаўляе свае сілы, размешчаныя па значнаму фронту, апаясваючаму ў выглядзе поўкруга італьянскую Абісінію. Гэты фронт ідзе па граніцы Англа-Егіпецкага Судана, Кеніі і Уганды і затым распасціраецца на Брытанскае Самалі з усходняга боку Абісініі.

Англійскі ўрад разлічвае між іншым і на ўнутраныя сілы ў Абісініі. З гэтай мэтай ён вывеў з забыцця абісінскага негуса Хайле Селасіе, якому прадастаўлена масцажыхарства ў Англа-Егіпецкім Судане.

Несумненна, што англійскае камандаванне разлічвае ў гэтым сектары афрыканскага мацерыка не толькі на свае ўласныя каланіяльныя войскі. Англійскі ўрад прыцягвае для барацьбы тут са сваім працоўнікам ваенна-паветраныя і пяхотныя часці Паўднёва-Афрыканскага Саюза, дамініёна Вялікабрытаніі. І ў першай сусветнай імперыялістычнай вайне Паўднёва-Афрыканскі Саюз пастаўляў Вялікабрытаніі вялікую частку гарматнага мяса, неабходнага для вядзення вайны ў Афрыцы супроць германскіх калоній.

Уступленне ў вайну Паўднёва-Афрыканскага Саюза праходзіла са скрыпам. К пачатку цяперашняй вайны ва ўладзе ў Паўднёва Афрыканскім Саюзе стаяў урад генерала Герцага, апошні ў якасці прэм'ер-міністра рашуча выказваўся супроць уступлення ў вайну на баку Вялікабрытаніі і заклікаў да таго, каб Паўднёвая Афрыка паследвала прыкладу дзяржавы Эйрэ і аб'явіла аб сваім нейтралітэце. Герцаг астаўся ў меншасці, бо ў кабінеце міністраў перамагла групіроўка Смутса, даўняга прыслужніка брытанскага імперыялізма і прыхільніка вайны з Германіяй. Герцаг вымушан быў выйсці ў адстаўку, і Смутс заняў яго месца. Аднак супраціўленне бурскай нацыянальнай партыі, узначальваемай Герцагам, істотна паслабляе магчымасць скарыстання Вялікабрытаніяй значных ваенных сіл Паўднёва-Афрыканскага Саюза. Так, да гэтага часу тут не ўведзена ўсеагульная воінская павіннасць. У выніку Паўднёва-Афрыканскі Саюз мог паслаць на фронт у Кенію і Уганду ў асноўным толькі ваенна-паветраныя злучэнні.



За апошні час Італія атрымала ў зоне Суэцкага канала некаторыя перавагі, бо ёй удалося дабіцца адкрыцця французскага порта Джыбуці (на Красным моры) для італьянскага ганцлю. Гэта было абумоўлена італа-французскім пагадненнем аб перамір'і. Дарога Адыс-Абеба—Джыбуці, якая з'яўляецца асноўнай транспартнай артэрыяй Абісініі, прадастаўлена цяпер да паслуг Італіі.

Канечны вынік італьянскай кампаніі ў Усходняй Афрыцы будзе, напэўна, залежаць ад зыходу барацьбы на поўначы Афрыкі і ў прыватнасці ў Егіпце.

Егіпет лічыцца фармальна незалежнай краінай, але па дагавору 1936 года, які, у сваю чаргу, з'яўляўся завяршэннем доўгага палітычнага панавання Англіі ў Егіпце, апошні вымушан быў стаць навечна саюзнікам Вялікабрытаніі і прадаставіць ёй сваю тэрыторыю ў якасці плацдарма супроць любой дзяржавы, якая знаходзіцца з Вялікабрытаніяй у стане вайны. У сілу гэтага дагавора Егіпет парваў дыпламатычныя адносіны з Германіяй у пачатку верасня 1939 года, а калі пачалася вайна з Італіяй, Егіпту прышлося разарваць дыпламатычныя адносіны і з Італіяй.

Егіпецкі ўрад, які ўзначальваўся Махер Пашы, устрымаўся ад аб'яўлення Італіі вайны. Змяніўшы яго новы кабінет, значна больш блізкі да англійскіх палітычных кругоў у Егіпце, не пайшоў у гэтым напрамку далей.

Вайны паміж Італіяй і Егіптам фармальна няма і зараз. Але гэта не больш чым фармальнасць: з егіпецкай тэрыторыі падымаюцца англійскія самалёты для аперацый супроць італьянскіх баз у Кірэнаіцы і Лівіі; Італія таксама не астаецца ў даўгу і накіроўвае ўдары сваёй авіяцыі і на базу Мірса-Матрух у Паўночна-Заходнім Егіпце і на Александрыю.

Тут, гэта значыць у Егіпце і ў прылягаючых да Егіпта тэрыторыях Палестыны і Транспарданіі, размешчаных па Аравійскім поўвостраве, Англія сканцэнтравала армію генерала Уэйвела. Дакладныя размеры гэтай арміі невядомы. Армія Уэйвела складалася да нядаўняга часу з англа-французскіх сіл, якія размешчаны ў краінах Леванта і ўтварыліся з самых разнастайных часцей. Пасля паражэння Францыі становішча змянілася. Частка французскіх каланіяльных войск выпала з гэтага злучэння. На армію ўскладзены разнастайныя і цяжкія задачы: ёй прыходзіцца адначасова адыгрываць ролю рэзерва ў барацьбе Англіі за арабскі Усход абараняць важнейшыя для Англіі іракскія нафтаправады, супроцьстаяць спробам ператварыць Французскую Сірыю ў плацдарм для германа-італьянскіх сіл і, апрача таго, служыць асноўнай базай англійскага панавання ў Егіпце.

Праўда, у ўсходняй частцы Міжземнага мора Англія мае цэлы рад выдатных марскіх баз. Гэта—Суэцкі канал з яго портам Суэц і Порт-Саідам, гэта—Егіпет з яго выдатнай гаванню ў Александрыі, гэта—Палестына з Хайфай, востраў Кіпр з ваеннай базай у Фамагусце. Але ўсяму гэтаму Італія можа процістаставіць ваенныя фарпосты ў Лівіі і Кірэнаіцы і астравы Дадэканеза і Родас, з якіх італьянская авіяцыя робіць ужо налёты на Хайфу.

Дарогі, пабудаваныя італьянскімі інжынерамі па паўночнаму ўзбярэжжу Лівіі і Кірэнаіцы ў напрамку да Егіпта, самі па сабе нядрэнныя, і калі-б Італіі ўдалося перакінуць у Лівію значную колькасць войск з метраполіі, то становішча Англіі ў Егіпце сур'ёзна-бы пагоршылася.

Ці ўдасца Італіі перакінуць новыя сілы ў Лівію—гэта залежыць перш за ўсё ад таго, ці зможа Італія атрымаць у свае рукі панаванне хаця-б у заходняй частцы Міжземнага мора.

У гэтым святле зразумелы апасенні Англіі за лёс Гібралтара, ваеннай крэпасці пры ўваходзе ў заходнюю частку Міжземнага мора і дыпламатычная барацьба за Іспанію між удзельнікамі вайны. Скарыстаўшы гэтую барацьбу, Іспанія здолела ўжо захваціць Танжэр—багаты гандлёвы порт, размешчаны недалёка ад Гібралтара на паўночна-афрыканскім беразе Атлантычнага акіяна. Вядома, што Італія і Германія гатовы таксама абяцаць Іспаніі і Гібралтар у абмен на падтрыманне ў вайне супроць Англіі.

Такім чынам, вайна ў Афрыцы з'яўляецца вельмі важным фактарам, расшыраючым арбіту другой імперыялістычнай вайны ў цэлым. Асноўнай прычынай, штурхаючай ваюючыя краіны на афрыканскі плацдарм, з'яўляюцца выключна багатыя сыравінныя крыніцы Афрыкі. Егіпецкая бавоўна, жалеза, фасфаты і збожжа французскай Паўночнай Афрыкі, запасы нафты ў Абісініі, кофе, пянька, пальмавы алей, какао, золата і серабро, пастаўляемыя іншымі калоніямі, — вось прадмет імперыялістычных спрэчак. У новым перадзеле свету, з-за якога ідзе другая імперыялістычная вайна, афрыканскія калоніі намячаюцца ў якасці першачарговага аб'екта гэтага перадзелу.

Прафесар І. ЗВАВІЧ.

З А Р У Б Я Ж О М

Прамова прэм'ер-міністра Фінляндыі Руці

ХЕЛЬСІНКІ, 20 жніўня. (ТАСС). 18 жніўня з прамовай па радыё выступіў прэм'ер-міністр Фінляндыі Руці.

Адзначыўшы цяжкае эканамічнае становішча Фінляндыі, Руці заявіў, што фінляндскі ўрад прымае меры да таго, каб прадстаячая зіма не была галоднай. Асноўную ўвагу Руці ў сваёй прамове ўдзяліў совецка-фінляндскім адносінам. Руці заявіў, што асноўныя мерапрыемствы, прадугледжаныя мірным дагаворам паміж СССР і Фінляндыяй, ужо рэалізаваны. Новая дзяржаўная граніца, сказаў Руці, ужо намечана, адпаведныя дакументы ратыфіцыраваны і абмен імі зроблен.

Заключаны ў адпаведнасці з мірным дагаворам гандлёвы дагавор паміж Фінляндыяй і СССР, прадаўжаў Руці, адкрывае шырокія магчымасці для ажыўленага гандлю. Чыгунка Кеміярві—Кандалакша, якая ў сучасны момант з магчымай быстратой будуецца на тэрыторыі Фінляндыі і працяг якой на тэрыторыі СССР ужо гатоў, у значнай меры будзе садзейнічаць чыгуначным зносінам паміж абодвума краінамі. Адноўлена таксама тэлефонная, паштовая і тэлеграфная сувязь.

Далей Руці паведаміў аб згодзе Совецкага ўрада перадаць Фінляндыі архівы з адышоўшых да СССР тэрыторый. Совецкі ўрад праявіў, заявіў Руці, добрую волю і ў адносінах прадастаўлення магчымасці перасяліцца ў Фінляндыю той часткі насельніцтва адышоўшых да СССР тэрыторый, якое выразіла адпаведнае жаданне.

Руці адзначыў далей, што фінляндскі ўрад прыняў прапанову СССР аб дэмілітарызацыі Аландскіх астравоў.

У заключэнне Руці заявіў, што стварэнне моцнага фундамента ў адносінах паміж Фінляндыяй і СССР гарантыруе развіццё эканамічных адносін паміж абодвума краінамі і ў будучым.

Выступленне Чэрчыля ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 20 жніўня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае па радыё выступленне Чэрчыля ў палаце абшчын з аглядам ваенных дзеянняў.

Указаўшы на адрозненне цяперашняй вайны ад вайны 1914 года, Чэрчыль заявіў, што зараз «ваюючыя народы ўцягнуты ў вайну пагалоўна. У вайну ўцягнуты не толькі салдаты, але і ўсё насельніцтва—мужчыны, жанчыны і дзеці. Фронт праходзіць цяпер усюды. Акопы капаюцца і ў гарадах, і ў сёлах. Кожная вёска ператвараецца ў крэпасць, і ўсе дарогі забарыкадураваны».

Далей Чэрчыль сказаў:—Мы лічым, што гэтыя новыя формы вайны поўнасцю адпавядаюць духу і рэсурсам англійскага народа і Брытанскай імперыі. Мы лічым, што калі мы атрымаем дастаткова ўзбраення і дастаткова ўцягнемся ў вайну, гэтыя метады вайны будуць больш выгаднымі для нас, чым масавыя забойствы на Сомме або ў Пашэндэлі. Англія зараз згуртавана і зможа паказаць праціўніку многае такое, чаго ён і не мяркуе.

Наша геаграфічнае становішча, панаванне на моры і дружба са Злучанымі Штатамі даюць нам магчымасць скарыстаць рэсурсы ўсяго свету і выпускаць зброю ўсіх родаў высокай якасці і ў такіх колькасцях, у якіх яе да гэтага часу выпускала толькі нацыянал-соцыялісцкая Германія.

Зараз пружыны нашай наступальнай магутнасці павольна сціскаюцца, і мы павінны рашуча і метадычна рыхтавацца да кампаній 1941 і 1942 гг. Два або тры гады—гэта невялікі тэрмін нават у нашым кароткім жыцці. Тым больш яны нічога не значаць у гісторыі парода. Гэта не азначае, што ўся наша энергія ў гэтыя гады будзе накіравана выключна на абарону Англіі. Дзяржавы, уладаючыя сухаземнымі і марскімі сіламі, маюць многа магчымасцей, і мы павінны быць гатовы іх скарыстаць.

Адным з сродкаў давесці гэту вайну да хутчэйшага завяршэння з'яўляецца наша здольнасць пераканаць праціўніка не словамі, а справай у тым, што мы ўладаем і воляй, і сродкамі не толькі для бясконцага вядзення барацьбы, але і для нанясення цяжкіх і нечаканых удараў. Дарога да перамогі можа аказацца не такой доўгай, як мы чакаем. Але мы не маем права разлічваць на гэта. Будзь гэта дарога доўгай ці кароткай, усеянай перашкодамі або гладкай, мы маем намер давесці нашу справу да канца. Мы маем намер падтрымліваць і праводзіць найстражэйшую блакаду не толькі Германіі, але таксама Італіі і Францыі і ўсіх іншых краін, якія аказаліся пад уладай Германіі. Я чытаў у газетах, што Гітлер таксама аб'явіў блакаду англійскім астравам. Ніхто не можа скардзіцца па гэтаму поваду.

Спыняючыся на высоўваўшыхся за апошні час шматлікіх прапановах аб дапушчэнні правозу харчоў у акупіраваныя Германіяй краіны, Чэрчыль заявіў, што англійскі ўрад адхіляе гэтыя прапановы.

З таго часу,—прадаўжае Чэрчыль,—як да ўлады прышоў новы ўрад, прайшло звыш трох месяцаў. Якія жахі абрушыліся на нас з гэтага часу: даверлівая Галандыя была захвачана, яе каралеўскі дом выгнан, мірны горад Ротэрдам ператварыўся ў месца кровапраліцця. Бельгія была захвачана і разбіта. Наша экспедыцыйная армія была адрэзана і амаль захвачана.

Ёй удалося ўнікнуць гэтага амаль цудам і цаною страты ўсяго яе снаражэння. Наш саюзнік—Францыя выйшла з вайны. Італія выступіла супроць нас. Уся Францыя знаходзіцца ва ўладзе праціўніка. Усе яе запасы ваенных матэрыялаў паступілі ўжо або могуць паступіць у распараджэнне праціўніка. У Вішы створан урад, які ў любы момант можа стаць нашым ворагам. Усё заходняе ўзбярэжжа Еўропы, ад Нордкапа да іспанскай граніцы, знаходзіцца ў германскіх руках. Усе порты, усе аэрадромы на гэтым вельмі шырокім фронце скарыстоўваюцца супроць нас у якасці патэнцыяльных плацдармаў для ўрывання. Апрача таго, германская авіяцыя, да гэтага часу колькасна пераўзыходзячая нашу авіяцыю, атрымала базу ў такой непасрэднай блізкасці да нашых астравоў, што наступіла іменна такое становішча, якога мы апасаліся: бамбардыроўшчыкі праціўніка не толькі дасягаюць на працягу некалькіх мінут і з розных старон нашага ўзбярэжжа, але і могуць суправаджацца знішчальнікамі. Калі-б у пачатку мая нам была прадказана такая перспектыва, то нам паказалася-б немагчымым вытрымаць да канца гэты перыяд жахаў і няшчасця так, як мы вытрымліваем яго.

Зараз з цвёрдай верай у канчатковую перамогу і стаўшы значна мацнейшымі, чым мы былі калі-небудзь раней Англія і Брытанская імперыя не адступілі і не пахіснуліся. Мы пераўзбройлі і перабудавалі армію ў такіх размерах, якія яшчэ некалькі месяцаў таму назад паказаліся-б неажыццявімымі. Дзякуючы нашым прыяцелям мы перавозім праз Атлантычны акіян велізарныя колькасці ўзбраення, усіх родаў гарматы, вінтоўкі, кулямёты, снарады, патроны. Усё гэта дастаўляецца без страты хоць-бы адной гарматы ці патрона. Нашы заводы працуюць з такой інтэнсіўнасцю, як яны ніколі не працавалі раней.

Уся англійская армія знаходзіцца ў Англіі. Звыш двух мільёнаў людзей маюць у руках вінтоўкі і штыхі. Тры чвэрці гэтай колькасці знаходзяцца ў рэгулярнай арміі. Мы ніколі не мелі такіх армій у Англіі ў ваенны час. Чым мацней будзе наша армія ў Англіі, тым буйней павінна быць экспедыцыйная армія праціўніка. У сваю чаргу, чым буйней экспедыцыйная армія праціўніка, тым лягчэй будзе для нашага флота выявіць яе сканцэнтраванне, перахапіць і знішчыць яе па шляху к Англіі. Апрача таго, праціўнік будзе адчуваць больш затрудненняў у снабжэнні вялікай арміі, калі яму калі-небудзь удасца высадзіць яе, не гледзячы на безупынныя атакі з мора і з паветра на камунікацыі праціўніка.

Як і ў дні Нельсона, першай лініяй нашай абароны з'яўляюцца порты праціўніка. Аэрафотаздымка з разведчых самалётаў значна падмацавала нашы старыя прынцыпы. Наш ваенна-марскі флот стаў значна мацней, чым у пачатку вайны. Значнае ваенна-марское будаўніцтва, разгорнутае пасля пачатку вайны, пачынае прыносіць плады. Мы спадзяемся, што нашы заакіянскія прыяцелі своечасова накіруюць нам неабходныя падмацаванні для таго, каб запоўніць разрыў паміж размерамі флота мірнага часу 1939 года і яго размерамі ў ваенны час для 1941 года. Мы стрымліваем актыўнасць падводных лодак праціўніка і справіліся з магнітнымі мінамі. Танаж гандлёвых суднаў, плаваючых пад англійскім флагам, пасля года неабмежаванай падводнай вайны і 8 месяцаў інтэнсіўных мінных атак стаў большым, чым у пачатку вайны. Апрача таго, мы маем пад сваім кантролем не менш 4 млн. тон суднаў захвачаных Германіяй краін. Гэтыя судны знайшлі прытулак у портах самой Англіі або Брытанскай імперыі. Нашы харчовыя запасы значна выраслі. Я гавару гэта не дзеля хвастаўства. Нам яшчэ пагражаюць велізарныя небяспекі, але і перавагі, і рэсурсы нашы велізарны. Мы маем усе падставы адчуваць сябе ў стане прадаўжаць вайну, калі патрэбна будзе, у адзіноцтве і, калі спатрэбіцца, на працягу многіх год.

Моцныя паветраныя баі, якія адбываліся над Англіяй на працягу апошніх некалькіх тыдняў, у апошні час дасягнулі вялікага напружання. Яшчэ вельмі рана прадугадваць межы іх маштаба і працягласці. Мы, безумоўна, павінны чакаць, што праціўнік прадпрыме яшчэ большыя намаганні, чым да гэтага часу. Ва Францыі і Нідэрландах прадаўжаецца пабудова аэрадромаў, і туды дастаўляюцца матэрыялы і эскадрыллі самалётаў для нападу на нас. Умовы і ход барацьбы да гэтага часу складваліся ў нашу карысць. Два месяцы таму назад я заявіў у палаце абшчын, што калі ва Францыі наша знішчальная авіяцыя паносіла германскай авіяцыі ў два або ў тры разы большыя страты, чым яна сама несла, і калі ў час баёў ля Дзюнкерка суадносіны склалі 3—4:1 у нашу карысць, то пры нападзе на Англію гэтыя суадносіны будуць яшчэ больш высокімі. Гэта, безумоўна, аказалася верным.

Несумненна, што авіяцыя праціўніка колькасна значна пераўзыходзіць нашу. Аднак размеры вытворчасці нашай прамысловасці пераўзыходзяць ужо размеры вытворчасці германскай прамысловасці. Апрача таго, прадукцыя амерыканскай прамысловасці толькі яшчэ пачала паступаць да нас. Колькасць нашых бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў цяпер, пасля ўсіх паветраных баёў, стала значна большай, чым калі-небудзь раней. Мы лічым і ўпэўнены, што мы зможам прадаўжаць барацьбу ў паветры так доўга, як гэтага захоча праціўнік, і чым больш працяглай будзе барацьба, тым хутчэй размеры нашай авіяцыі параўнаюцца з размерамі авіяцыі праціўніка, а затым і перавысяць іх, што дасць магчымасць устанавіць панаванне ў паветры, ад якога ў значнай меры залежыць вынік вайны.

Некалькі месяцаў таму назад мы прышлі да заключэння, што ў інтарэсах як Злучаных Штатаў, так і Брытанскай імперыі, каб Злучаныя Штаты мелі сродкі для марской і паветранай абароны Заходняга поўшар'я. У сувязі з гэтым мы рашылі паведаміць урад ЗША, што мы ахвотна прадаставім у яго распараджэнне апавядныя раёны нашых уладанняў за Атлантычным акіянам для забеспячэння большай бяспекі ЗША.

Нядаўна Рузвельт заявіў, што ён хацеў-бы абмеркаваць з намі, а таксама з Канадай і Нью-Фаундлэндам пытанне аб стварэнні амерыканскіх ваенна-марскіх і ваенна-паветраных баз у Нью-Фаундлэндзе і Вест-Індыі. Гутарка, вядома, не ідзе аб перадачы суверэнітэта над гэтымі пунктамі. Аднак англійскі ўрад упаўне гатоў прадаставіць Злучаным Штатам сродкі абароны ў арэнду на 99 год. Гэтыя дзеянні, несумненна, азначаюць, што Англія і Злучаныя Штаты да некаторай ступені аб'ядноўваюцца ў некаторых сферах іх дзейнасці для ўзаемнай і агульнай выгады.

Італьянская нота нейтральным краінам

РЫМ, 20 жніўня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Стэфані, італьянскі ўрад звярнуўся да нейтральных краін, вядучых марскі гандаль, з наступнай нотай: «Нотай ад 15 чэрвеня італьянскі ўрад паведаміў урадам нейтральных краін, вядучым марскі гандаль, што ў сувязі з мерамі блакады, прынятымі праціўнікам ў адносінах да Італіі, яна вымушана заявіць, што гандлёвыя параходы, якія накіроўваюцца ў парты праціўніка і знаходзяцца ў 30 мілях ад яго берагоў, падвяргаюцца рыску і што Італія знімае з сябе адказнасць за вынікі для тых суднаў, якія не прымуць пад увагу гэтае папярэджанне.

Паўтараючы цяпер сваё папярэджанне, італьянскі ўрад звяртае ўвагу гэтых урадаў на той факт, што зона ўздоўж узбярэжжа калоній, пратэктаратаў і падмандатных англійскіх тэрыторый, а таксама Егіпта, дзе знаходзяцца англійскія марскія і паветраныя сілы, з прычыны развіцця ваенных дзеянняў ператварылася ў зону ваенных аперацый. Гэта адносіцца да брытанскага ўзбярэжжа ў Міжземным і Красным морах, Адэнскім заліве, а таксама да ўзбярэжжа англійскіх калоній у Афрыцы, узбярэжжа Егіпта і Судана.

Усе судны, якія плаваюць у гэтых зонах, могуць быць знішчаны мінамі або іншымі сродкамі вайны. Каб унікнуць гэтага, італьянскі ўрад прапануе ўрадам нейтральных краін зрабіць усё магчымае, каб іх судны старанна ўнікалі навігацыі ў апасных зонах.

Італьянскі ўрад знімае з сябе адказнасць за тыя страты, якія могуць быць нанесены суднам у гэтых зонах. З свайго боку італьянскі ўрад не мае намераў перашкаджаць транзіту суднаў нейтральных краін праз праліўы, праход праз якія неабходны для навігацыі».

Камюніке англійскага міністэрства авіяцыі

ЛОНДАН, 21 жніўня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора самалёты праціўніка скінулі бомбы на аэдзін з гарадоў у графстве Эсекс, а таксама ў Паўднёвым Уэльсе. У абодвух выпадках пашкоджаны будынкі, ёсць забітыя і раненыя. Пасля поўдня над паўднёва-ўсходнім узбярэжжам паявіліся буйныя злучэнні германскай авіяцыі, якія бамбардыравалі аэзін з гаралоў. Сур'ёзных пашкоджанняў няма. Учора да вечара было збіта сем непрыяцельскіх самалётаў.

Паведамляецца таксама, што 18 жніўня ў час палёту германскай авіяцыі праціўнік, па ўдакладненых даных, страціў 152 самалёты.

ЛОНДАН, 21 жніўня. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што 19 жніўня англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі разведчыя палёты над Галандыяй і Паўночным морам. Былі бамбардыраваны батарэі зенітнай артылерыі паблізу Амстэрдама і аэрадром у Флісінгене.

У ноч на 20 жніўня ў Германіі, а таксама на тэрыторыі, акупіраванай немцамі, падверглася бамбардыроўцы 30 аэрадромаў. Другая эскадрылля бамбардыравала марскую базу ў Кіле, нафтаперагонны завод у Гановеры, электрастанцыю ў Чэрневіц—на поўнач ад Лейпцыга, нафтасховы ў Абмес паблізу Барлю, а таксама рад стратэгічных пунктаў на лініі камунікацый Рурскай обласці ў паўночна-заходнім раёне Германіі.

Паведамленне італьянскага камандавання

РЫМ, 21 жніўня. (ТАСС). Італьянскае камандаванне перадае наступную зводку: «У былым Брытанскім Самалі салдаты «вярблюжага корпуса» і туземныя атрады склалі зброю. У Бербера знойдзены 5 самалётаў, пашкоджаных у час нашых паветраных атак.

Праціўнік зрабіў шматлікія паветраныя налёты на населеныя пункты Абісініі, якія маюць другараднае значэнне. Страты нязначныя.

Нашы бамбардыроўшчыкі з поспехам атакавалі паветраныя базы на Мальце».

Заявы Рузвельта

НЬЮ-ЙОРК, 21 жніўня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што Рузвельт адхіліў прапанову кандыдата ў прэзідэнты ад рэспубліканскай партыі Уіклі аб правядзенні серыі дыспутаў на палітычныя тэмы, заявіўшы, што цяперашняя міжнародная абстаноўка не дазваляе праводзіць актыўную перадвыбарную кампанію.

ЛОНДАН, 21 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе Агенцтва Рэйтэр на прэс-канферэнцыі Рузвельт заявіў, што перагаворы з Англіяй аб набыцці баз па англійскіх астравах у Атлантычным акіяне развіваюцца здавальняюча. Рузвельт, аднак, адмовіўся адказаць на пытанне, калі можна чакаць розультата перагавораў.

Францыя напярэдадні голаду

ВІШЫ, 21 жніўня. (ТАСС). Англійскі ўрад яшчэ не адказаў па зварот Францыі аб змякчэнні рэжыма блакады. Лічаць, што адказу наогул не будзе. Французскія газеты прызнаюць, што скора ў Францыі будзе сапраўдны голад.

Прымусовая рэгістрацыя новага ўраджаю ў Фінляндыі

ХЕЛЬСІНКІ, 20 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе газета «Суомен сосіялідэмакраці», міністэрства снабжэння выдала загад аб прымусовай рэгістрацыі ўраджаю збожжа, а таксама сена, бульбы і гароху.

Забастоўка рабочых электрапрамысловасці ў Мексіцы

НЬЮ-ЙОРК, 21 жніўня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што рабочыя электрапрамысловасці гарадоў Тампіко, Вера-Крус, Масатлан, Торэон, Шуэбла і Сакатэкас (Мексіка) аб'явілі забастоўку, патрабуючы павелічэння заработнай платы.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

На паўднёвым захадзе правінцыі Гуандун 19 жніўня кітайскія войскі ва ўпорным баі занялі адзін з пунктаў, што за 90 кілометраў ад Цыньчжоу. Захвачана многа зброі і амуніцыі.

Вестак аб становішчы ў Цэнтральным і Паўночным Кітаі няма.

21 жніўня 4 атрады японскай авіяцыі бамбардыравалі некалькі пунктаў на захад ад Чунцына.

У час налёту японскай авіяцыі на Чунцын 20 жніўня кітайская зенітная артылерыя збіла 4 бамбардыроўшчыкі.

21 жніўня (ТАСС).



На стралковым трэнажы ў Н-скай часці ЗахАВА. Малодшы лейтэнант А. С. Сідараў аварае правільнасць ізгатоўкі да стральбы чырвонаармейца-кулямётчыка Н. Я. Чм... (Фотахроніка БЕЛТА).

НА МІНСКІМ РАДЫЁЗАВОДЗЕ

У строй соцыялістычных прадпрыемстваў БССР уступае новы мінскі радыёзавод—адзіны ў рэспубліцы. Галоўныя вытворчыя карпусы завода ў асноўным гатовы. За кароткі тэрмін, 9 месяцаў, будаўнікі прарабілі велізарную работу. Створана выдатнае прадпрыемства.

На плошчы ў 6 гектараў узнік радыёгарадок. Пабудован асноўны трохпавярховы корпус, займаючы цэлы квартал. Даўжыня яго — 120 метраў, вышыня—17 метраў. Гатоў новы лабараторны корпус. Рэканструіраван былы будынак дрэваапрацоўчага цэха завода імені Молатава.

Заводскія карпусы адзначаюцца выключнай прасторнасцю, багацтвам паветра і святла. Вентыляцыйная і ацяпляльная сістэмы пабудаваны па апошняму слову тэхнікі. Ахова працы пастаўлена на высокую ступень. Тут усюды асабліва адчуваюцца сталінскія клопаты аб людзях, аб паляпшэнні ўмоў працы. Будуюцца шасцімётровыя асфальтыраваныя дарожкі для электракараў і шырокія асфальтыраваныя тратуары па заводскім двары.

На заводзе—15 цэхаў. Тут будуць працаваць рабочыя 78 прафесій і каля 200 інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Абсталяванне—прэсы, аўтаматы, рэвальверныя, фрэзерныя, свідравальныя, дрэваапрацоўчыя станкі ўжо ўстаноўлены. Тут ёсць машыны для вырабу складанейшых дэталей радыёпрыёмнікаў.

Працуюць ужо цэхі: механа-загатоўчы, інструментальны, папяровых кандэнсатараў і пераменных супраціўленняў і дэтэрні галоўнага механіка. Усе яны няты вырабам разнастайных і шматлікіх дэталей для радыёпрыёмнікаў. Паступ... ўступяць у эксплаатацыю і астатнія цэхі.

Напружаная творчая работа ідзе ў ... структарскім бюро і лабараторыі, дзе ... лектыў з 25 інжынераў-канструктар... тэхнікаў распрацоўваюць новыя дасканалыя тыпы совецкіх радыёпрыёмнікаў. Гэта работа ўжо ўвянчалася поспе... Падрыхтаваны да серыйнага выпуску ... дэлі прыёмнікаў—5-лямпавага «Піон», 6-лямпавага «КІМ» і 9-лямпа... «Маршал», якія будуць атрымліваць энергію ад сеці пераменнага тока. Сконструіраван калгасны батарэйны прыёмн... усіліцель (вузел) для радыёфікацыі с... Усе канструкцыі распрацаваны пад кіраўніцтвам совецкіх канструктараў ... Бройда, Шулькіна, Гардона, Шульм... Клінгофера і інш. Цяпер творчая м... спецыялістаў завода працуе над ства... нем новага магутнага прыёмніка з ... ма громкагаварыцелямі і кнопачнай ... стройкай, а таксама над прыёмнікам ... легкавых аўтамашын «ЗІС».

Ужо ў гэтым годзе па намечанай ... граме завод павінен даць краіне 20. ... радыёпрыёмнікаў. Праектная магутн... яго пры двухзменнай рабоце—162 т... чы радыёпрыёмнікаў у год.

М. КІН.

Работнікі мастацтваў—да слаўнай гадавіны

З вялікай актыўнасцю рыхтуюцца работнікі мастацтваў рэспублікі да знамянальнай даты — гадавіны вызвалення працоўных Заходнай Беларусі ад ярма польскіх паноў.

Арганізуюцца канцэртныя брыгады з артыстаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, Яўрэйскага тэатра, Філармоніі і эстрады, якія выедуць у заходнія вобласці рэспублікі для мастацкага абслугоўвання прапоўных у дні святкавання.

Абласныя аддзелы мастацтваў арганізуюць лекцыі на тэмы «Мастацтва Совецкай Беларусі», «Дасягненні совецкага мастацтва ў заходніх абласцях БССР».

У дзень свята — 17 верасня — у Беластоку адбудзецца ўрачыстая закладка помніка ў чэсць вызвалення Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй.

У абласных дамах народнай творчасці заходніх абласцей рыхтуюцца выстаўкі работ мастакоў. (БЕЛТА).

Усесаюзныя спаборніцтвы па баскетболу ў Мінску

Сёння на мінскім стадыёне імені Кірава пачынаецца розыгрыш фінальнага першынства пераможцаў зон па трэцяй групе баскетбольных каманд Саюза.

Удзельнічаюць мужчынскія і жаночыя каманды гаралоў Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Одэсы, Свердлоўска і Ташкента.

Стаханаўскія рэйсы парахода „Большэвік"

ГОМЕЛЬ. Стаханаўскай работай вод... Днепра-Дзвінскага рачнога парахода... сустракаюць галавіну стаханаўскага ... ху.

Выдатныя ўзоры ў рабоце пака... капітан парахода «Большэвік» тав. ... нік. Ён даставіў на аллегласці 271 к... метра караван даўжынёй у 1.000 мет... Замест 3.000 кубаметраў пароход пра... 4.149 кубаметраў будаўнічага лесу. ... ўжо чацверты стаханаўскі рэйс парах... «Большэвік». (БЕЛТА).

ПАВЕДАМЛЕННЕ

22 жніўня, у 8 гадзін вечара, у ... кай зале Дома партактыва Мінгар... КП(б)Б склікае нараду рэдактараў шм... тыражак, насценных газет заводаў, ф... рык, устаноў, саматужна-прамысловых ... целей і магазінаў сістэмы Дзяржгар... па пытанню задач нізавога друку ... рацьбе за рэалізацыю Указаў Прэзідыу... Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвен... 10 ліпеня 1940 года.

Яўку на нараду забяспечваюць сак... тары пярвічных партарганізацый.

Сакратар Мінгаркома КП(б)Б ВЛАСА...

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖЦЫРК (парк ім. Горкага, тэл. 22-725).
СЕННЯ ВЯЛІКАЯ ЦЫРКАВАЯ ПРАГРАМА ў 3 аддзяленнях.
гастролі ВЕЛА-ФІГУРЫСТАЎ — 5 ВАРТАНЮ.
ВЯЛІКІ СПАРТЫЎНЫ ВЕЧАР
Удзельнічаюць усе барцы.
БОРУЦЦА З ПАРЫ. ПРАДАЎЖЭННЕ МАТЧАЎ ФРАНЦУЗСКАЙ БАРАЦЬБЫ.
1. Барацьба 40 мінут БРАВЕРМАН—ПЕТРОЎ
2. БУРЭВОЙ—САЛАЎЕЎ
3. БІНДЭР—СТРЫЖАК
Пачатак у 9 га дзін вечара.
Пачатак барацьбы ў 11 г. вечара.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» ЛЮДЗІ НАШАГА КАЛГАСА
Кінотэатр «Родина» БУДНІ
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЗНІШЧАЛЬНІКІ
Кінотэатр «Спартак» КАТАРГА
Дзіцячы кінотэатр «ЛИЧНОЕ ДЕЛО»
Кінотэатр «Навіны дня» БАЯВАЯ МАЛАДОСЦЬ (Фізкультпарад у Маскве)

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

з 23 жніўня адкрываецца папярэдні продаж білетаў на сямідзёнку
1 і 3 ВЕРАСНЯ
КВЕТКА ШЧАСЦЯ
Опера ў 3 дзеях, з пралогам. Музыка А. ТУРАНКОВА.
КАСЫ ТЭАТРА ПРАЦУЮЦЬ з 12 да 6 і вечара ў НАСТУПНЫХ МЯСЦАХ: пл. СВАБОДЫ (б. Дом саюзаў), ДОМ УРАДА (правае крыло, газетны кіёск), ГАСЦІНІЦА «БЕЛАРУСЬ», ГАСЦІНІЦА «ЕЎРОПА» і памяшканне ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА (пл. Парыжскай Комуны). ДАВЕДКІ па тэл. 21-420.

БЕЛІЦКАМУ ЗООТЭХНІКУМУ ПАТРАБУЕЦЦА ВЕТУРАЧ-ВЫКЛАДЧЫК.
З ЗАЯВАМІ ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: Сенненскі р-н, п/а Беліца, Беліцкі зоатэхнікум.

ДЗЯРЖЦЫРК
АНОНС!
ГЭТЫМІ ДНЯМІ ПРЫБЫВАЕ для ўдзелу ў магчымых спаборніцтвах НАШУ ЛЯРНЕЙШЫ БАРЭЦ СВЕТУ ЗАСЛ. АРТ. РЭСПУБЛІКІ ІВАН МАКСІМАВІЧ ПАДДУБНЫ

У памяшканні Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР
ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР.
22 жніўня
„ЗАГОВОР"
Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.
Каса адкрыта з 2 г. дня да 9 г. вечара.
Гарадскія касы з 12 г. дня да 6 г. вечара.

Памяшканне Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драмтэатра.
ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР.
СЕННЯ
„СИЛЬВА"
Музкамедыя ў 3 дзеях.
Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.
Білеты ў касе тэатра з 2 да 8 г. 30 м. вечара і ў гарадскіх касах з 12 да 6 г. вечара.

СКУРГАЛАНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЕНІ КУЙБЫШЭВА
ПАТРАБУЮЦЦА:
БУХГАЛТАРЫ, МЕХАНІКІ ПА ШВЕЙНЫХ МАШЫНАХ, СЛЕСАРЫ І НЕКВАЛІФІКАВАНЫЯ РАБОЧЫЯ.
ЗВЯРТАЦЦА: вул. К. Лібкнехта, 38, аддзел кадраў.

ТРЭСТУ «ГАЛОЎМУКА»
ПАТРАБУЮЦЦА:
ПЛАНАВІКІ, БУХГАЛТАРЫ, МАШЫНІСТКА, ЭЛЕКТРАМЕХАНІК, МЕХАНІК-ДЫЗЕЛІСТ І КУРЭР.
ЗВЯРТАЦЦА: вул. Урыцкага, 20.

ЗАВОД ІМЕНІ ВАРАШЫЛАВА
аб'яўляе набор вучняў-токараў
Прымаюцца асобы абодвух полаў ад 16 год, якія маюць адукацыю не менш 5 груп.
ВУЧНІ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА СТЫПЕНДЫЯЙ да 130 руб. у месяц.
Інтэрнатам не забяспечваюцца.
ЗВЯРТАЦЦА: ВУЛ. ВАРАШЫЛАВА, 46, АДДЗЕЛ КАДРАЎ.

Беларускі вучэбны камбінат УПК ЦУНГУ Дзяржплана СССР
аб'яўляе НАБОР курсантаў
НА 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ БУХГАЛТАРАЎ для машынна-трактарных станцый БССР.
На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж рахунковай работы не менш 1 года па двайной сістэме і асвету не ніжэй 7 класаў.
Стыпендыя 175—225 руб. у месяц у залежнасці ад паспяховасці і 50 руб. кватэрных.
Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакументы: пасведчанне аб асвеце, метрычны выпіс, даведкі аб стане здароўя, аб працоўным стажы ў галіне рахункаводства і аб аслабаненні з апошняга месца работы, аўтабіяграфію, дзве фотакартні, а таксама паштовых марак на 60 кап.
ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 1 ВЕРАСНЯ.
ІСПЫТЫ па роднай мове, матэматыцы, палітграмаце і ўчоту.
Яўка на іспыты — па выкліку камбіната.
Праезд на іспыты камбінатам не аплачваецца.
Даведкі можна атрымаць з 11 да 2 гадзін дня.
ЗАЯВЫ З ДАКУМЕНТАМІ пасылаць па адрасу: г. Мінск, Рэвалюцыйная, № 8, вучэбнаму камбінату УПК ЦУНГУ Дзяржплана СССР.
ДЫРЭКЦЫЯ.

У3345. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. Кр., М., Ш.